


ЦІКАВЫ РЭЙТЫНГ АДУКАЦЫЙНЫХ ДАСЯГНЕННЯЎ 5

ЯК ВЫРАСЦІЦЬ НОВЫХ АРТЫСТАЎ 8



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

10 СНЕЖНЯ 2019 г. АЎТОРАК № 234 (29101)

**ЦЫТАТА ДНЯ**



**Ірына КАСЦЕВІЧ, міністр працы і сацыяльнай абароны:**

*«Калі сем'і кажуць, што не плануюць раней чым у 29 гадоў мець першае дзіця, гэта сведчыць пра тое, што мы павінны перафарматаваць свае меры падтрымкі. Жанчыны старэйшага пакалення нараджалі ў сярэднім з 20 да 40 гадоў, у сучасных маці гэты тэрмін скараціўся на 10 гадоў — з 30 да 40. У якасці адной з мер стымулявання нараджальнасці разглядаецца так званы бонус за хуткасць. Прапрацоўваецца пытанне аб такой дапамозе тым мамам, якія ў кароткатэрміновым перыядзе, на працягу 3-4 гадоў, паспяваюць нарадзіць другое і наступнае дзіця».*

# ПРАЦЯГ АДНАГО ЗНАЁМСТВА




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Улетку 2018-га наш фотакарэспандэнт Анатоль Кляшчук пазнаёміўся з братамі Міхайлам і Пятром Марозамі з вёскі Слабодка Бешанковіцкага раёна. Пераехалі сюды з суседняй Сенькаўшчыны сем гадоў таму, бо там ужо не засталося жыхароў. Прывабілі нашага вандроўнага фатографа яркія малюнкі на сядзібе, якія, як высветлілася, зрабілі самі гаспадары. Атрымалася прыгожае фота для першай «звяздоўскай» паласы.**

**А нядаўна спадар Анатоль зноў завітаў у тыя мясціны. І з прыемным здзіўленнем даведаўся, што тая яго публікацыя, павялічаная, раздрукаваная на каляровым прынтары, вісіць у Марозаў у хаце на бачным месцы, бы карціна. Пётр МАРОЗ нават на вуліцу яе вынес, каб лепш можна было разгледзець і сфатаграфаваць. Зноў цікавы сюжэт атрымаўся, праўда?**

**Заставайцеся са «Звяздой». Магчыма, ужо зусім хутка вашы знаёмыя, блізкія або вы самі станеце героямі нашай першай старонкі. Мы заўсёды побач і працуем найперш для вас, дарагія нашы чытачы!**

## КОРАТКА

- **Беларусь у рэйтынгу чалавечага развіцця паднялася на 50-е месца.**
- Запазычанасць расійскіх контрагентаў перад беларускімі суб'ектамі гаспадарання склала $2 млрд 115,7 млн.
- **У Віцебску праз некалькі гадоў з'явіцца цэнтр фігурнага катання на каньках і закрытая трэніровачная лядовая арэна.**
- Кінастудыя «Беларусьфільм» сёлета за кошт экскурсій атрымала больш за $20 тыс. даходу.
- **Закрыты паказ фільма «Купала» рэжысёра Уладзіміра Янкоўскага адбудзецца 17 снежня ў кінатэатры «Масква».**
- Кіраўніцтва новага чэмпіёна Беларусі па футболе — «Дынама-Брэст» — прыняло рашэнне не працягваць кантракт з чэшскім спецыялістам Марцэлам Лічкам.

Самі з ВУСАмі: нататкі навaспечаных вяскоўцаў

# ДАРОГА ДА РАЗУМЕННЯ,

## або Як воз зрушыўся з месца

**Ад Мінска да нашай Малой Вусы шэсцьдзясят кіламетраў з хвосцікам. Збольшага ехаць даводзіцца па шыкоўнай трасе М1, якую ў народзе называюць «алімпійкай», — дарога будавалася да маскоўскай Алімпіяды 1980 года. Але два кіламетры гравійкі ад пасёлка Каменка да Вялікай Вусы былі, мякка кажучы, аскомай на шляху да дома. Менш чым за год, пакуль мы будаваліся, менавіта на гэтым адрэзку дарогі наша «Стэпачка» (так ласкава называем сваю машыну) «згубіла» падвеску. І, як высветлілася, не яна адна.**




СТАР. 4

Ваша бяспека

# ХІМІЯ Ў ХАТУ

## ЯКУЮ ШКОДУ МОГУЦЬ ПРЫНЕСЦІ БЯСКРЫЎДНЫЯ ЦАЦКІ?



**Амаль кожны дзень вытворцы прапануюць нам новыя тавары — суперэфектыўныя пральныя парашкі, неверагодных колераў дэкаратыўную касметыку, модныя дзіцячыя цацкі і іншае. Але наколькі ўсе яны бяспечныя для чалавека і навакольнага асяроддзя?**

**У сённяшнім быце немагчыма абысціся без хімічных прадуктаў — тавараў, выраблены з хімічных рэчываў і прэпаратаў. Дзякуючы такой вытворчасці на прылаўках з'яўляюцца бытавая хімія, будаўнічыя матэрыялы, розныя віды касметыкі і нават дзіцячыя цацкі. Пры гэтым многія з такіх тавараў могуць утрымліваць рэчывы, небяспечныя для здароўя чалавека і навакольнага асяроддзя. Давайце разбірацца разам.**

СТАР. 9

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

СЯБРОЎ У НОВЫМ ГОДЗЕ НЕ МЯНЯЮЦЬ!

Ідзе падпіска на «Звязду» на І квартал і І паўгоддзе 2020 года.

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

# РОЎНЫЯ ЎМОВЫ ДЛЯ ЖЫЦЦЯ І РАБОТЫ

## павінны мець людзі і суб'екты гаспадарання ў Саюзнай дзяржаве Беларусі і Расіі

**Аляксандр Лукашэнка напярэдадні 20-годдзя падпісання Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы правёў перагаворы ў Сочы са сваім расійскім калегам Уладзімірам Пуціным. Прэзідэнт Беларусі падкрэсліў: бакі сабраліся на сустрэчу, каб паглядзець, як ідзе работа над аналізам Саюзнага дагавора і адпаведнымі пытаннямі. «Не просім нічога, не настойваем ні на чым. Мы дамовіліся даўно, развіваючы наш дагавор, — людзі і суб'екты гаспадарання павінны мець роўныя ўмовы для жыцця і работы. Роўныя ўмовы — больш нічога не трэба», — перадае словы Прэзідэнта прэс-служба.**

Дарэчы, сустрэча ў Сочы адбылася з ініцыятывы Уладзіміра Пуціна, і кіраўнік беларускай дзяржавы ў першую чаргу падзякаваў за запрашэнне. Ён адзначыў, што за 20 гадоў існавання Саюза зроблена нямала, але існуе яшчэ шэраг нявырашаных пытанняў: «Вы заўважылі, што нашы ўрады сур'ёзна аналізавалі дагавор, глядзелі, што можна зрабіць, што мы сёння не можам рабіць. Каб лішнюю работу не выконваць. І мы з вамі да гэтага пытання звярталіся не раз і карэктавалі дзеянні нашых груп па аналізе і выпрацоўцы некаторых планаў далейшай інтэграцыі».

Прэзідэнт Беларусі заявіў, што наша краіна не просіць танны газ і нафту, а гатова купляць блакітнае паліва і па 200 долараў ЗША (за 1 тысячу кубічных метраў). Цяпер цана складае 127 долараў за 1 тысячу кубічных метраў. «Калі нашы прадпрыемствы купляюць за 200 долараў, значыць, і канкуруючыя прадпрыемствы (у Расіі. — **«Зв.»**) павінны мець такую ж цану. У адваротным выпадку мы проста не зададзім аснову нашых адносін, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Вы як вучоны, кандыдат эканамічных навук разумееце гэта не горш за мяне. Вось адзіная праблема, над якой у прынцыпе працуюць нашы ўрады. Мы сабраліся для таго, каб вырашыць гэтыя пытанні».

Ён адзначыў, што перад сустрэчай з Уладзімірам Пуціным праглядзеў расійскія тэлеканалы, інфармацыю на шэрагу Telegram-каналаў: «Усе задаюцца пытаннем у Расіі: а што Лукашэнка, з чым ён туды едзе, з чым ён прыехаў наогул? Я скажу, Уладзімір Уладзіміравіч, мы сапраўды нямала зрабілі, але мала гаворым аб тым, што зрабілі, а трэба было б».

Прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін выказаў надзею на тое, што краіны і далей будуць рабіць усё, каб народы працягвалі збліжэнне ў сферы эканомікі і ў сацыяльнай галіне.

Сустрэча прэзідэнтаў у сочынскай рэзідэнцыі Бочараў Ручай ішла амаль пяць з паловай гадзін. На перагаворах таксама прысутнічалі прэм'ер-міністры і іншыя прадстаўнікі ўрадавых дэлегацый дзвюх краін. Наступная сустрэча лідараў Беларусі і Расіі запланавана 20 снежня ў Санкт-Пецярбургу, у гэты дзень адбудзецца і нефармальны саміт ЕАЭС.

### ❍ У тэму

Пра вынікі перагавораў журналістам расказаў **пасол Беларусі ў Расіі Уладзімір СЯМАШКА.** Па яго словах, знойдзена выйсце па пытаннях зняцця існуючых абмежаванняў на пастаўкі беларускіх прадуктаў харчавання ў Расійскую Федэрацыю. «Пасля даволі доўгага абмеркавання Прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін згадзіўся з тым, што прэрагатыва або права закрываць, напрыклад, беларускія мясакамбінаты, малаказаводы павінна належаць галоўнаму ветэрынарнаму ўрачу Беларусі: ён павінен разбірацца, што так, што не так, — перадае словы Уладзіміра Сямашкі БелТА. — І калі раптам узнікнуць спрэчныя нейкія пытанні, то гэта павінна выносіцца наверх, напрыклад, на агульную калегію Мінсельгасхарча Беларусі і Мінсельгаса Расіі. А можа, трэба ствараць у Еўразійскай эканамічнай камісіі які-небудзь такі орган. Але вырашылі лепш пакуль на дваіх».

Цяпер бакі павінны замацаваць дасягнутыя дамоўленасці на паперы. Кіраўнік беларускага дыппрадстаўніцтва адзначыў, што на сустрэчы прэзідэнты знайшлі развязку па дарожнай карце супрацоўніцтва мытных службаў: «Гэта было няпростае пытанне. Стаіць задача да 1 чэрвеня 2020 года адпрацаваць усю нарматыўную базу — і беларускую, і расійскую: там сотні заканадаўчых актаў, дзясяткі міжурадавых пагадненняў».

Каментуючы вынікі сустрэчы, Уладзімір Сямашка расказаў журналістам, што Беларусь разлічвае на кампенсацыю за брудную нафту каля 70 мільёнаў долараў, а пытанне па цэнах на газ вырашыцца на працягу двух найбліжэйшых тыдняў.

Уладзімір Сямашка канстатаваў, што кампенсацыя выдаткаў з-за падатковага манеўру — адна са складаных праблем у двухбаковых адносінах. «Пакуль мы не дамовімся па ўніфікацыі падатковага заканадаўства, немагчыма будзе развязаць гэтае пытанне, — сказаў ён. — Таму там тэрміны ссунуты яшчэ на адзін год. Пастаўлена задача, каб пытанні ўніфікацыі падаткаабкладання былі вырашаны на працягу 2020—2021 гадоў і пачалі працаваць рэальна з 1 студзеня 2022 года. Пытанне поўнай кампенсацыі выдаткаў ад падатковага манеўру можа быць вырашана з 1 студзеня 2022 года, так і дамовіліся».

На тое, што перагаворы прайшлі плённа і сур'ёзна, зблізіліся пазіцыі па пытаннях нафты і газу, звярнуў увагу і **міністр эканамічнага развіцця Расіі Максім АРЭШКІН.**

Паводле яго слоў, з панядзелка на экспертным узроўні пачался прапрацоўка атрыманых указанняў. «Для таго каб усё гэта сфармуляваць і пагрузіць у дарожныя карты. Затым будзем дакладваць прэм'ерам, прэзідэнтам, — расказаў Максім Арэшкін. — Мы разумеем, як па большай частцы з іх (спрэчных пытанняў. — **«Зв.»**) рушыць наперад. Нам указанні дадзены. Цяпер будзем прапрацоўваць і рухацца далей».

Вынікі і перспектывы

# АКЦЭНТ НА СПАДАРОЖНІК

## У канцы года Уладзімір КРАЎЦОЎ правёў прэс-канферэнцыю ў Скідзелі

**Горад-спадарожнік Гродна стаў адной з галоўных тэм падчас сустрэчы з журналістамі. І невыпадкова. У Скідзеля даволі перспектыўная будучыня, і многае з таго, што задумана, пачынае рэалізоўвацца ўжо сёння. Тэмпу работам дадае і той факт, што горад аб'яўлены сталіцай абласных Дажынак-2020.**

### Галоўнае — жыллё і занятасць

Скідзель — самы буйны горад у Гродзенскім раёне, можна сказаць, што гэта яго неафіцыйны цэнтр. Менавіта тут праходзяць усе значныя раённыя святы і іншыя мерапрыемствы. У горадзе існуе вельмі моцная вытворчая база, у прыватнасці знаходзяцца адзін з найбуйнейшых у краіне цукровых камбінатаў, вялікая птушкафабрыка, камбінат хлебапрадуктаў. Усё гэта стварае магутны патэнцыял для актыўнага развіцця. Чарговы імпульс Скідзель атрымаў у 2016 годзе, калі яму быў нададзены статус спадарожніка Гродна. Тады ж распрацавалі і генеральны план з бліжэйшай канцэпцыяй да 2025 года. І, як паведаміў старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір Краўцоў, гэты план увасабляецца ў жыццё. У першую чаргу значна вырaслі тэмпы жыллёвага будаўніцтва. Плануецца, што за пяць гадоў жыллёвы фонд павялічыцца ў два разы.

Вырашаюцца праблемы, якія збіраліся гадамі. Гэта ў першую чаргу ачышчальныя збудаванні. Недасканалая ачыстка сцёкаў на



Фота grodnonews.by

вытворчых прадпрыемствах стварала непрыемны пах ва ўсім наваколлі. Цяпер такой праблемы не існуе. На цукровым камбінаце дзейнічае сучасная, дасканалая сістэма ачысткі сцёкаў па найноўшых тэхналогіях. Шукаюцца магчымасці, каб рэалізаваць падобны праект па ачышчальных збудаваннях самога горада. Магчыма, гэта будзе зроблена праз ільготныя крэдытныя рэсурсы. Пад асаблівай увагай і сацыяльная сфера.

— Не так даўно горад атрымаў сучасную мадэрнізаваную школу, — дабудаваны новы корпус са стадыёнам, майстэрнямі, сталоўкай. Будзем здымаць вострую праблему дашкольнага выхавання — налета ўвядзём дзіцячы сад на 190 месцаў. Завяршаецца рамонт паліклінікі і бальніцы, мы вызначылі іх фармат — якія паслугі застануцца тут, якія будуць аказвацца ў Гродне, — зазначыў губернатар.

Значны аб'ём работ чакае Скідзель, калі пачнецца падрыхтоўка да абласных «Дажынак». Толькі на добраўпарадкаванне вуліц выдаткавана 13 мільёнаў рублёў. Сучаснае начынне агульным коштам тры мільёны рублёў атрымае Дом культуры — прыгожы палац, дзе будуць ушанаваны работнікі АПК рэгіёна.

Горад-спадарожнік павінен «разгрузіць» абласны цэнтр, таму частка вытворчых магутнасцяў пераедзе ў Скідзель. Гэта ў значнай ступені забяспечыць работай мясцовае насельніцтва. Увогуле ў Скідзеля даволі ўдалая лагістычная пазіцыя, праз горад праходзіць аўтамабільная траса М6. У будучыні палепшыцца і чыгуначны рух — сюды будуць хадзіць сучасныя цягнікі.

### Новы «Азот» і шэраг іншых праектаў

Падчас прэс-канферэнцыі былі агучаны і новыя праекты рэгіёна. У наступным годзе плануецца запусціць першую чаргу АЭС у Астраўцы. А ў абласным цэнтры пачнецца будаўніцтва новага гіганта «Гродна Азот». Інвестарамі, а гэта Кітай і Італія, укладзена 1 мільярд 200 мільёнаў долараў. Што датычыцца старых карпусоў завода, дык некаторыя з іх плануецца мадэрнізаваць, а тыя, што фізічна і маральна састарэлі, — знесці.

Значны акцэнт будзе зроблены на дрэваапрацоўцы. Такая вытворчасць з удзелам аўстрыйскага капіталу пачне дзейнічаць у Свіслачы, у Смаргоні ствараецца мэблевае прадпрыемства. Упершыню ў рэгіёне наладзяць вытворчасць пелет — такі завод будуецца ў Навагрудку, яшчэ адзін з'явіцца ў Смаргоні.

У Гродне маюць намер пабудаваць яшчэ адзін шклозавод. Вызначана і пляцоўка — на ўскраіку горада, на тэрыторыі СЭЗ «Гроднаінвест». Згодна з бізнес-планам, прадпрыемства будзе выпускаць больш лёгкія шкляныя бутэлькі.

— Увесь свет цяпер адыходзіць ад пэт-бутэлек, бо іх складана перапрацоўваць, яны наносяць шкоду прыродзе. Да таго ж існуе патрэба ў шкляной тары, мы шмат імпартуем. Таму гэты праект не толькі экалагічны, але і эканамічна выгадны — у нас добрая ўласная сыравіна, а таксама ёсць рынкі збыту, — падкрэсліў Уладзімір Краўцоў.

### Дынаміка «бязвізу»

Турыстычная тэма апошнім часам стала адной з самых папулярных. І не без падстаў. Толькі ў рамках «бязвізу» з пачатку года вобласць наведала 120 тысяч чалавек, а ўсяго прыбыло каля 400 тысяч турыстаў. Удасканальваецца заканадаўчая база, якая спрыяе росту турыстычнага патоку. Сёлета ў лістападзе бязвізавая зона павялічылася і аб'яднала Гродзенскую і Брэсцкую вобласці. На думку кіраўніка рэгіёна, гэта вельмі спрыяльны сектар эканомікі, і пры належным падыходзе можна зарабіць да 30 % валавога прадукту. Так, напрыклад, адбываецца ў многіх краінах. Але для гэтага трэба мець добрую турыстычную базу, развіваць сэрвіс, маршруты. Пра гэта павінны клапаціцца ў першую чаргу мясцовыя ўлады.

— У бязвізавую зону сёлета ўключаны Воранаўскі раён, ён мяжуе з Літвой, ёсць і пагранпераход. Але для турыста тут мала цікавага. Хоць некаторыя аб'екты маглі б прывабіць, напрыклад, старажытны парк і сядзіба ў вёсцы Больцінікі. Але для таго, каб яны сталі турыстычнымі аб'ектамі, іх трэба прывесці ў належны стан, — падкрэсліў Уладзімір Краўцоў.

На развіццё турызму накіраваны і многія міжнародныя праекты. Напрыклад, нядаўна выдзелена 200 тысяч еўра ў рамках стварэння веламаршруту «Аўгуст Вела», яго працягласць — 50 кіламетраў. Праект прадугледжвае месцы адпачынку, варкаўт-пляцоўку, пракат веласіпедаў. На Аўгустоўскі канал прыйдзе і водны транспарт. На сродкі тэхнічнай дапамогі будуць закуплены сучасныя параходы. Цяпер каля канала ідзе аднаўленне старажытнага палаца ў Свяцку. Тут будзе піваварня з «жывым» півам, якое турысты змогуць прадэгуставаць ужо налета. Таксама ў 2020-м завершыцца рэканструкцыя першай чаргі Старога замка ў Гродне. Паводле слоў Уладзіміра Краўцова, гэты аб'ект стане самым знакавым у краіне.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

Надвор'е

# РАНІЦАЙ І ЎНАЧЫ НА ДАРОГАХ ГАЛАЛЁДЗІЦА...

## Паводле прагнозаў сіноптыкаў, на выхадныя зноў пацяплее да плюс 6 градусаў

**Другі тыдзень зімы запар у нас чакаецца няўстойлівае з павышаным тэмпературным фонам надвор'е. Будуць адносна цёплыя кароткачасовыя ападкі, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

У сераду ўначы і раніцай месцамі, а ўдзень па поўдні краіны чакаюцца невялікія кароткачасовыя ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. Амаль усюды слабы туман і галалёд. На асобных участках дарог з'явіцца галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 4 да плюс 2 градусаў, удзень — ад мінус 2 да плюс 4 градусаў.

У чацвер месцамі па краіне таксама чакаюцца кароткачасовы мокры снег і дождж, слабы туман і галалёд. На асобных участках дарог будзе назірацца галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 4 градусаў да 2 цяпла, удзень — ад мінус 2 градусаў па поўначы да 5 цяпла па поўдні краіны. У пятніцу атмасферныя франты абумовяць уначы месцамі, раніцай і ўдзень на большай частцы тэрыторыі краіны кароткачасовыя ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. У асобных раёнах чакаюцца туман, слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 3 градусаў да 3 цяпла, удзень — ад мінус 1 да плюс 5 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных спецыялістаў, у суботу ў многіх раёнах краіны пройдуць невялікія кароткачасовыя ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. У асобных раёнах чакаюцца туман, слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 3 да плюс 4 градусаў, па ўсходзе пры праясненнях да мінус 5 градусаў. Удзень будзе ад мінус 1 да плюс 4 градусаў, па паўднёвым захадзе краіны — да 6 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### У Парыжы адбыўся «нармандскі саміт»

Учора ў Парыжы адбылася сустрэча кіраўнікоў дзяржаў «нармандскай чацвёркі» — Расіі, Украіны, Францыі, Германіі, — каб абмеркаваць далейшае ўрэгуляванне сітуацыі ў Данбасе. Перагавораў такога ўзроўню не было з 2016 года. Гасцей прымаў прэзідэнт Францыі Эмануэль Макрон, Германію, як звычайна, прадставіла Ангела Меркель. Акрамя таго, упершыню асабіста сустрэліся прэзідэнты Расіі і Украіны Уладзімір Пуцін і Уладзімір Зяленскі.



Пасля 18.00 па раскладзе была запланаваная сумесная рабочая сесія чатырох кіраўнікоў дзяржаў. А каля дзевяці вечара чакалася сумесная прэс-канферэнцыя, чаго, дарэчы, удзельнікі «Нармандскага фармату» раней не рабілі.

У цэлым напярэдадні сустрэчы палітычныя аналітыкі сыходзіліся ў думках, што чакаць нейкіх прарываў ад саміту не выпадае. Расія і Украіна, мяркуючы па ўсім, прыехалі ў Парыж з намерамі, якія супярэчаць адзін аднаму. Прыйсці да кампрамісу бакам будзе вельмі няпроста. У цэнтры дыскусіі ўжо каторы раз апынуцца Мінскія пагадненні, а менавіта парадак іх выканання.

Расійская газета «Коммерсант» у сваёй учарашняй публікацыі таксама адзначыла, што прарыўных рашэнняў у рамках саміту чакаць не варта. Украінскія ўлады разумеюць, што выкананне імі Мінскіх пагадненняў ператворыць Данбас у альтэрнатыўны, непадкантрольны Кіеву цэнтр уплыву на знешнюю і ўнутраную палітыку, і маюць намер нанава дамовіцца з гэтай нагоды. Расію задавальняе альбо поўнае выкананне пагадненняў, альбо захаванне статус-кво, адзначалася ў артыкуле.

### У Турцыі ўвялі падатак на пражыванне

Прэзідэнт Турцыі Таіп Эрдаган падпісаў закон аб увядзенні ў краіне «падатку на пражыванне». Дакумент, які прадугледжвае двухпрацэнтны падатак на пражыванне ў гатэлях, увойдзе ў сілу 1 красавіка 2020 года. Адзначаецца, што ён будзе накіраваны не на турыстаў, а на ўсе аб'екты размяшчэння, у тым ліку гатэлі на курортах. Згодна з нававядзеннямі, гасцініцы будуць плаціць падатак як з цаны размяшчэння пастаяльца, так і з паслуг, якія будуць яму аказвацца, нават такіх, як харчаванне, басейн і забавы.

### WADA амаль выключыла Расію са спорту

Учора ў Лазане адбылося выканкаўчае пасяджэнне выканкама Сусветнага антыдопінгавага агенцтва (WADA), на якім была разгледжана справа аб магчымых махінацыях з допінг-пробамі спартсменаў з Расіі і маніпуляцыях данымі маскоўскай антыдопінгавай лабараторыі РУСАДА.

У выніку расійскіх спартсменаў на чатыры гады пазбавілі права ўдзельнічаць пад нацыянальным сцягам у буйных міжнародных спаборніцтвах — Алімпійскіх гульнях і чэмпіянатах свету, паведамляе РІА «Навіны». РУСАДА прызналі не адпавядаючым антыдопінгаваму кодэксу.



Адзначаецца, што Расія таксама пазбаўляецца на чатыры гады права прымаць чэмпіянаты свету і падаваць заяўкі на іх правядзенне. Акрамя гэтага, выканкам WADA ўвёў чатырохгадовую забарону на наведванне міжнародных спартыўных мерапрыемстваў расійскімі дзяржслужачымі і кіраўніцтвам Алімпійскага і Параалімпійскага камітэтаў краіны. Пазней у РУСАДА дадалі, што «чыстыя» спартсмены, не замешаныя ў допінгавых махінацыях, усё ж змогуць браць удзел у спаборніцтвах пад нейтральным сцягам і без выканання гімна падчас узнагароджання.

Допінгавая гісторыя, у якую трапіў увесь расійскі спорт, бярэ свой пачатак у лістападзе 2015 года, калі Усерасійская федэрацыя лёгкай атлетыкі была пазбаўленая членства ў складзе Міжнароднай асацыяцыі лёгкаатлетычных федэрацый.

Хакей

# ПАЧЫНАЕМ ВЯРТАННЕ Ў ЭЛІТУ?

## У Мінску на лёдзе «Чыжоўка-Арэны» стартаваў маладзёжны чэмпіянат свету па хакеі ў дывізіёне ІА

**Чэмпіянат адкрыў матч зборных Нарвегіі і Славеніі** *(на фота)*, **першую шайбу на турніры закінуў нарвежац Рэдне, яго каманда і стала пераможцай стартавага паядынку. Беларуская зборная ў першы дзень згуляла з камандай Аўстрыі, за дзень да яе старту арганізатары паведамілі, што ў продажы на дзевяцітысячную арэну засталося ўсяго 500 білетаў.**

Цяперашні склад маладзёжнай зборнай Беларусі спецыялісты называюць самым моцным за апошнія гады — кажуць, гэта новая хваля беларускага хакея, здольная ў будучыні вярнуць былую моц нацыянальнай хакейнай дружыне. Сярод лідараў зборнай называюць Аляксея Протаса, Ілью Усава, Уладзіслава Калачонка і іншых. Галоўны трэнер маладзёжнай зборнай Дзмітрый Дудзік адзначае велізарную канкурэнцыю ў камандзе.

Перад стартам да хлопцаў звярнуўся **старшыня Беларускай федэрацыі хакея Генадзь САВІЛАЎ.** Ён падкрэсліў, што гэтым разам у камандзе сабраліся ўсе наймацнейшыя гульцы, у тым ліку з-за акіяна. «Дзякуй усім, хто прыехаў у зборную. Напэўна, гэта ўнікальны выпадак, калі ўсе, хто ёсць у краіне, усе найлепшыя адгукнуліся. Бываюць розныя абставіны — траўмы, жыццёвыя сітуацыі, але гэтым разам яны вам не перашкодзілі — малайцы! Нагнятаць не будзем: вы ўсе ўмееце гуляць, усе ўмееце паказваць вынікі, якія прымушаюць нас верыць, што ўсё будзе нармальна».



Фота БелТА.

Наступнымі сапернікамі нашай зборнай стануць хакеісты з камандаў Даніі, Латвіі, Нарвегіі і Славеніі. Адзінае месца ў эліце атрымае пераможца групы.

«Нельга нікога недаацэньваць, усе зборныя на добрым узроўні, усе прывезлі топавыя склады, усе прыехалі перамагаць, а не змагацца за другое ці трэцяе месца, з усімі будзе цяжка, — адзначае **гулец зборнай Беларусі Валянцін ДЗЕМЧАНКА.** — Адзімі з лідараў, напэўна, будуць латвійцы, у іх добры малады склад. Наша задача паказаць у першую чаргу вынік, а не прыгожы хакей, таму мы не маем права на памылку».

Усе матчы мінскага турніру транслююць тэлеканал «Беларусь 5» і сайт Беларускай федэрацыі хакея Hockey.by.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

Крымінал, здарэнні

### 39 ручных гранат выявілі ў Оршы

**Боепрыпасы часоў Вялікай Айчыннай вайны былі знойдзены недалёка ад прыватнага жылога дома і будынка былой бальніцы ў завулку Далёкім райцэнтра.**

Будаўнікі падчас правядзення земляных работ на глыбіні каля 1,5 метра зачапілі экскаватарам старую скрыню, з якой высыпалася некалькі гранат. Пра сваю знаходку яны паведамілі ў міліцыю.

На месца здарэння акрамя правааховікаў прыбылі сапёры в/ч 5524 унутраных войскаў МУС Рэспублікі Беларусь. У траншэі імі было выяўлена 39 ручных гранат часоў вайны. Боепрыпасы былі вывезены ў бяспечнае месца і знішчаны, паведамілі ў аддзяленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Віцебскага аблвыканкама.

### Перакулілася аўтацыстэрна

**Ранкам ратавальнікам паступіла паведамленне аб дарожна-транспартным здарэнні з удзелам грузавога аўтамабіля з прычэпам-цыстэрнай масай 26 тон з дызельным палівам. Аўто перакулілася каля вёскі Пабедная Дзяржынскага раёна.**

У выніку ДТЗ з цыстэрны адбылася ўцечка каля шасці тон паліва, пацярпелых няма, паведамілі ў МНС. Плошча разліву на абочыну дарогі склала каля чатырох квадратных метраў. Аварыйнай брыгадай прадпрыемства-ўласніка грузу праводзіліся работы па перапампоўванні паліва і пастаноўцы аўтацыстэрны ў транспартнае становішча, ратавальнікі на працягу ўсяго часу забяспечвалі пажарную бяспеку.

Работы па рэкультывацыі забруджанага ўчастка глебы на месцы ДТЗ будуць праводзіцца пасля высновы спецыялістаў лабараторыі Дзяржынскага раённага цэнтра гігіены і эпідэміялогіі.

### Звязаў і ўтрымліваў знаёмых

#### Яны адмовіліся выпіць з мужчынам гарэлкі

**Крымінальная справа за незаконнае пазбаўленне волі распачата ў дачыненні да 24-гадовага жыхара вёскі Хотамель Столінскага раёна. У сярэдзіне кастрычніка мужчына залез у дом аднавяскоўкі, збіў яе сужыцеля, а затым абодвух звязаў і пакінуў ляжаць на падлозе, паведамілі ў МУС.**

Пацярпелых выявіла суседка, якая зайшла ў госці і адразу ж выклікала міліцыю. Гаспадары расказалі, што ўжо спалі, калі пачулі, як нехта вырваў металічную клямку, на якую замыкаліся ўваходныя дзверы. Няпрошаным госцем аказаўся знаёмы, які шукаў кампанію выпіць з ім гарэлкі.

Пара адмовілася ладзіць застолле і папрасіла аднавяскоўца сысці. Замест гэтага сусед пачаў лаяцца, а затым збіў мужчыну, які спрабаваў яго выправадзіць. Гаспадыня хацела абараніць каханага, аднак у выніку абодва апынуліся на падлозе са звязанымі рукамі і нагамі. У якасці падручных сродкаў падазраваны выкарыстаў шторы і кавалак шпагату. Перад сыходам ён збіў звязанага мужчыну гумавым шлангам, які знайшоў у двары.

У той жа вечар сышчыкі знайшлі маладога чалавека. З яго слоў, на злачынства ён рашыўся з-за моцнага ап'янення і адмовы пацярпелых выпіць з ім.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Факт

# У краіне пройдзе акцыя «Захавай сімвал свята»

**Ужо другі год запар лесагаспадарчыя ўстановы краіны будуць расказваць беларусам, як правільна даглядаць навагоднія дрэўцы ў кадках і прапаноўваць шырокі асартымент атрыбутаў свята.**

Акцыя «Захавай сімвал свята» традыцыйна стартуе ў дзень адкрыцця ёлачных кірмашоў — 20 снежня. Яна пройдзе ва ўсіх населеных пунктах краіны з колькасцю насельніцтва звыш 30 тысяч чалавек, паведамілі ў прэсслужбе Міністэрства лясной гаспадаркі.

Напярэдадні зімовых свят лягсасы і Рэспубліканскі лясны селекцыйна-насенняводчы цэнтр (РЛСНЦ) прапануюць беларусам набыць навагоднія дрэвы ў кадках, гаршках ці скрынях, захаваць іх да вясны (напрыклад, на балконе або дачы) і высадзіць у найбліжэйшым лясніцтве падчас акцыі «Тыдзень лесу», якая традыцыйна праходзіць у красавіку. Пры гэтым кожнаму пакупніку будзе ўручана памятка па доглядзе навагодняга дрэва.

Летась акцыю «Захавай сімвал свята» падтрымала больш за дзве тысячы чалавек. Паводле інфармацыі лесагаспадарчых устаноў, з кожным годам попыт на навагоднія дрэвы ў кадках расце. У асартыменце — елка еўрапейская і елка калючая, елка сербская, хвоя звычайная, туя заходняя і іншыя.

Адрасы гандлёвых пунктаў, дзе прадстаўляць прадукцыю лягсасаў і РЛСНЦ, у хуткім часе будуць апублікаваны на сайце Міністэрства лясной гаспадаркі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ДАРОГА ДА РАЗУМЕННЯ



Асфальт на дарозе — найлепшага перадНавагодняга падарунка для вуслян і не прыдумаеш.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Праўда, як ні круці, нам усё адно пашанцавала больш, чым астатнім. Старажылы расказвалі: быў час, калі кіроўцы ў адчаі, каб не псаваць падвеску, выездзілі сваімі машынамі «дарогу» на полі побач з той гравійкай.

Вядома, людзі неаднаразова звярталіся да мясцовай улады з просьбай пакласці асфальт. Але чыноўнікі мяняліся, а воз ніяк не кранаўся з месца.

Так супала, што дарогу пачалі рабіць неўзабаве пасля таго, як мы пераехалі жыць у вёску. І ўсё дзякуючы Ганне Уладзіміраўне Ярашовай, дом якой стаіць на ўездзе ў Вялікую Вусу. Хоць жанчына, калі ёй пра гэта кажаш, сціпла адмахваецца, маўляў, «без людзей у мяне нічога не атрымалася б. Толькі разам мы сіла».

Упершыню Ганну Уладзіміраўну я ўбачыла ўлетку. Як зараз памятаю, мы гулялі з сынам, а яна з мужам ездзіла на машыне і расклейвала аб'явы на слупах ды калодзежах. Запрашала народ на сход. Той, хто родам з вёскі, можа ўявіць, якая гэта падзея для вясковых людзей!

У тую апошнюю суботу ліпеня імжэў дожджык. Таму, каб не змачыць свайго на той момант дзевяцімесячнага Сымонку, да мясцовай крамы мы вырашылі пад'ехаць на машыне. Адмыслова выправіліся на сход усёй сям'ёй — нават мужаву бабулю, якая якраз у нас гасціла, прыхапілі. Шчыра прызнацца, думалі, мала хто выйдзе з хаты ў што такое надвор'е. Якое ж было здзіўленне, калі мы нават не змаглі пад'ехаць да крамы, каб прыпаркавацца, бо ўздоўж дарогі ўжо стаялі дзясяткі машын. Прычым людзі працягвалі падыходзіць — сем'ямі, з дзецьмі ды ўнукамі-праўнукамі. Каля крамы я тады налічыла пад сто чалавек, на сход завіталі нават дачнікі з садаводчага таварыства «Новая Вуса». Было бачна, што народ вельмі хвалюе гэтая гравійка.

Напярэдадні сходу Ганна Уладзіміраўна, аказваецца,



Здымкі са сходу я зрабіла адмыслова для сваёй маці, якая хвалявалася, што мы пераехалі жыць на хутар.

была на прыёме ў старшыні Уздзенскага райвыканкама. Той пагадзіўся, што праблема ёсць, асфальт трэба класці, але ж і мясцовыя жыхары няхай зробяць свой унёсак у агульную справу. Каб паведаміць пра гэта людзям, на сход прыехалі старшыня раённага Савета дэпутатаў, начальнік ДРБУ-163 і старшыня Уздзенскага сельвыканкама. Яны расказалі аб сваіх праблемах: у раёне шмат дарог, якія патрабуюць тэрміновага рамонту. Асфальт з нуля — гэта вельмі дарагое задавальненне. У прыватнасці, каб пакласці два кіламетры дарогі, спатрэбіцца каля 350 тысяч рублёў. Вуслянам прапанавалі падзяліць выдаткі з дзяржавай. Людзей жа цікавіла канкрэтыка — сума на тым, што да канца лета кіраўнік дарожнай службы прадставіць вяскоўцам першасны праект дарогі ды каштарыс.

Праз нейкі час на слупе з'явілася новая аб'ява. Ганна Уладзіміраўна зноў склікала аднавяскоўцаў на сход. Там паведаміла, што трэба сабраць па 200 рублёў з хаты. Акрамя таго, вырашылі падключыць мясцовую гаспадарку «Ліцвяны-Агра», лясгас, пілараму, прадпрымальнікаў, бо іх велікагрузныя машыны больш разбіваюць дарогу, чым легкавікі.

Ганна Ярашова тут жа папрасіла некалькіх самых актыўных жыхароў Вялікай Вусы, дапамагчы ёй збіраць з людзей грошы. Тыя адразу адгукнуліся. «А Іна — вось малайчынка, сама выклікалася. Кажа: нікога з Малой Вусы няма, давайце я, — гаворыць Ганна Уладзіміраўна. — Я таксама па жыцці кіруюся фразай «хто, калі не я».

Прадстаўнікі ўлады, як мне здалося, не чакалі ўбачыць столькі людзей на сходзе. Не думалі яны, відаць, і што вусляне будуць здаваць грошы. Бо, пагадзіцеся, 200 рублёў для вясковага чалавека істотная сума.

Тым не менш грошы сабралі даволі хутка. «У нас ёсць сям'я, дзе трое маюць інваліднасць, дык яны першыя здалі 200 рублёў, — дзеліцца Ганна Уладзіміраўна. — Кажуць: усе здаюць, як мы не здадзім. Бачыце, якія людзі ў нас дружныя!» І шчыра прызналася: «Ведаеце, я вельмі хвалявалася, што справа зноў зацягнецца. Што толькі ні казалі мне ў райвыканкаме: маўляў, збірайце грошы, цягам трох гадоў пакладзём асфальт. А я і думаю сабе: у нас ёсць вязні, людзі, якім па 94 гады, яны таксама здалі грошы. І так і не дачакаюцца дарогі? Іх жа можа не стаць у любы момант. Я не магла гэтага дапусціць. Людзі ж за мной пайшлі, даверыліся... Як я магла іх падвесці? Пра мяне на Вусе кажуць — як танк *(смяецца)*. Думала ўжо ісці на прыём да старшыні Мінаблвыканкама. А тут якраз у канцы верасня «прамая лінія» там праводзіцца. Думаю, дай патэлефаную. Не спала ўсю ноч. Хвалявалася, малілася, каб дазвоніцца, без эмоцый, якія часта не на карысць справе, данесці людскі боль. І вось ужо 11 кастрычніка мне прыйшоў ліст. Маўляў, старшыня Мінаблвыканкама Анатоль Ісачанка даручыў КУП «Мінаблдарбуд» да канца гэтага года заасфальтаваць участак дарогі Каменка — Вялікая Вуса. За кошт бюджэтных сродкаў. Грошы ж, якія людзі збіралі на дарогу, ім вернуць.

Ганна Уладзіміраўна прызналася, што адразу не паверыла сваім вачам. Нават заплакала ад шчасця. «Мы стварылі прэцэдэнт. Пакажыце мне хоць адну вёску, дзе людзі гатовыя з уласнай кішэні выкласці па 200 рублёў на дарогу. Я, да таго як выйсці на пенсію, працавала ў выканаўчай уладзе. Не па чутках ведаю, што на прыёмы да чыноўнікаў прыходзяць людзі з рознымі пытаннямі. Ім часта прапаноўваюць сабраць сход. У выніку добра калі 10 чалавек на яго прыйдзе. А ўжо каб грошы з уласнай кішэні на агульныя патрэбы збіралі, дык і гаворкі няма».

Падчас трэцяга сходу, які Ганна Уладзіміраўна сабрала, каб паведаміць аднавяскоўцам радасную навіну, нехта прапанаваў пачакаць і не раздаваць грошы, перакананца, што асфальт сапраўды пакладуць. Вусляне ніяк не маглі паверыць, што здарыцца цуд. Так доўга гэтага чакалі. Супакоіліся ды забралі свае грошы, толькі калі Ганна Уладзіміраўна паказала афіцыйны ліст, які атрымала.

Вельмі прыемна было глядзець на аднавяскоўцаў, якія, акрыленыя радаснай навіной, абдымаліся. Адчувалася, што кожны з іх памаладзеў гадоў на дзесяць. Ганну Уладзіміраўну тут жа прапанавалі выбраць старастай вёскі. Хтосьці падкінуў ідэю: калі пакладуць асфальт, зладзіць у Вусе свята з танцамі ды песнямі. Пачалі ўяўляць, як вынесуць на вуліцу сталы, накрыюць іх талакой.

І вось спяшаюся падзяліцца добрай навіной — да канца года засталіся лічаныя дні, а цуд на дарозе ўжо ляжыць. Вось такі перадНавагодні падарунак атрымаўся для нас, вяскоўцаў. Днямі, калі ехалі з мужам па новенькім асфальце, злавілі сябе на думцы: нас перапаўняе гонар, што жывём менавіта ў Вусе. Побач з неабыякавымі людзьмі, чыя хата не з краю.

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**
**Фота аўтара.**

---

Прававая гасцёўня

# КУДЫ «ГЛЯДЗІЦЬ» ВІДЭАКАМЕРА?

## Як даказаць, што сусед сочыць за вамі, а не за злодзеямі



**?** *Мой сусед устанавіў на сваім доме відэакамеру. Спачатку яна была накіравана на яго ўчастак, і мы не звярталі на яе ніякай увагі. Цяпер жа ён павярнуў камеру так, што яна «глядзіць» на наш участак. Нам з мужам гэта прычыняе нязручнасці. Асабліва мне, бо я — інвалід I групы: пасля інсульту ў мяне паралізаваны левая рука і левая нага. Я з цяжкасцю рухаюся з палачкай.*

*Звярталася з гэтым пытаннем да нашага ўчастковага інспектара — той кажа, што гэта дапушчальна. Аднак ён працуе нядаўна, можа, чагосьці не ведае? Днямі бачыла па тэлебачанні перадачу, дзе казалі, што нельга накіроўваць відэакамеру на суседзяў. Вельмі прашу адказаць, ці правільна робіць мой сусед з юрыдычнага пункту гледжання. Сітуацыя цягнецца ўжо больш за тры гады.*

**М. І., вёска Зелянец, Карэліцкі раён.**



Фота БелТА.

На пытанне адказвае **Алег КАРАЗЕЙ, начальнік упраўлення прафілактыкі МУС:**

— Падобныя звароты ад фізічных асоб, якія скардзяцца на неналежнае выкарыстанне відэакамер на падворку, — не рэдкасць. На жаль, заканадаўства краіны не ўтрымлівае нарматыўных актаў, якія рэгламентавалі б парадак выкарыстання фізічнымі асобамі сродкаў відэафіксацыі ў розных мэтах, такіх як ахова сваёй маёмасці ці назірання за зямельным участкам. Якіх-небудзь абмежаванняў па ўстаноўцы відэакамер, а таксама адзінага парадку іх выкарыстання фізічнымі асобамі ў законе не прапісана. Тым не менш можна паспрабаваць абараніць сябе і свае правы, даказаць, што відэакамера суседа прычыняе вам шкоду.

Пры выкарыстанні сродкаў відэафіксацыі неабходна ўлічваць шэраг нормаў, якія рэгулююць сумежныя грамадскія адносіны. Выкарыстанне сродкаў назірання не павінна парушаць правы і свабоды іншых асоб. Згодна з артыкулам 28 Канстытуцыі, кожны мае права на абарону ад незаконнага ўмяшання ў яго асабістае жыццё, у тым ліку ад замаху на тайну яго карэспандэнцыі, тэлефонных і іншых паведамленняў, на яго гонар і годнасць.

Згодна з другой часткай артыкула 18 Закона «Аб інфармацыі, інфарматызацыі і ахове інфармацыі» ад 10 лістапада 2008 года, збор, апрацоўка і захоўванне інфармацыі аб прыватным жыцці фізічнай асобы і персанальных даных, а таксама іх выкарыстанне не дазваляюцца толькі са згоды гэтай асобы.

Пад інфармацыяй аб прыватным жыцці фізічнай асобы і персанальнымі данымі маюць на ўвазе ў тым ліку і звесткі, якія складаюць асабістую і сямейную тайну, тайну тэлефонных размоў, паштовых і іншых паведамленняў, звесткі, што датычацца стану здароўя асобы.

Згодна з артыкулам 151 Грамадзянскага кодэкса (ГК), недатыкальнасць прыватнага жыцця, асабістая і сямейная таямніцы адносяцца да нематэрыяльных даброт. Згодна з пунктам 2 артыкула 151 ГК, нематэрыяльныя даброты ахоўваюцца ў адпаведнасці з грамадзянскім заканадаўствам у выпадках і парадку, якія прадугледжаны гэтым заканадаўствам.

Калі вы лічыце, што парушаны вашы правы на недатыкальнасць прыватнага жыцця, асабістую і сямейную тайну, вы маеце права выкарыстаць любыя формы і спосабы аховы, якія пералічаны ў артыкуле 11 ГК: напрыклад, аднавіць становішча, якое існавала да парушэння права, спыніць дзеянні, якія парушаюць права, запатрабаваць кампенсацыі маральнай шкоды і г. д.

Згодна з часткай 1 артыкула 152 ГК («Кампенсацыя маральнай шкоды»), калі грамадзяніну нанесена маральная шкода (фізічныя або маральныя пакуты) дзеяннямі, якія парушаюць яго асабістыя немаёмасныя правы, чалавек мае права патрабаваць ад парушальніка грашовую кампенсацыю ўказанай шкоды. Для гэтага трэба падаць іск у суд.

Калі ж ёсць падстава меркаваць, што адбываецца мэтанакіраваны збор і назапашванне звестак пра прыватнае жыццё, гэта ўжо прычына разгледзець у справе прыкметы складу злачынства, якое прадугледжана артыкулам 179 Крымінальнага кодэкса («Незаконны збор або распаўсюджванне інфармацыі пра прыватнае жыццё»). У гэтым выпадку вы маеце права звярнуцца ў тэрытарыяльны орган унутраных спраў з заявай, па факце якой будзе праведзена праверка.

У любым выпадку, перш чым распачынаць пэўныя дзеянні ў дачыненні да суседа, раю пагаварыць з ім і растлумачыць, што яго відэакамера вас турбуе. Толькі калі дамовіцца не ўдасца, варта звяртацца па дапамогу ў кампетэнтныя органы.

**Шаноўныя чытачы, калі ў вас узніклі пытанні юрыдычнага характару, дасылайце іх на наш паштовы або электронны адрас sidarok@zviazda.by. У «Прававой гасцёўні» разам са спецыялістамі Мінюста мы будзем шукаць на іх адказы.**

Кампетэнтна

# СІГНАЛЫ, ЯКІЯ НЕЛЬГА ІГНАРАВАЦЬ

## Толькі 4 % беларускіх падлеткаў маюць высокія паказчыкі ў чытацкай адукаванасці

**«Расія здала пазіцыі ў адукацыйным рэйтынгу PISA», «Расійскія школьнікі не трапілі ў топ-20 рэйтынгу па чытанні і матэматыцы», «Казахстанскія школьнікі паказалі вынікі ніжэй за сярэднія. Чаму?», «Украінскія школьнікі амаль правалілі тэст», «Украіна ў рэйтынгу PISA: не Уругвай, але пакуль не Беларусь» — такімі загалоўкамі стракацяць апошнія дні ўсе СМІ на постсавецкай прасторы.**

### РАЗБУРЭННЕ МІФАЎ

Як і чакалася, вынікі міжнароднага даследавання адукацыйных дасягненняў навучэнцаў PISA-2018 (Program for International Student Assessment), што былі агучаны 3 снежня, сталі прадметам аналізу эфектыўнасці сістэм адукацыі ва ўсіх краінах, якія ў ім удзельнічалі. Але калі Эстонія канстатуе, што вучэбныя дасягненні тутэйшых школьнікаў — найлепшыя ў Еўропе, то нашы суседзі-ўкраінцы прызнаюць: праблемы ёсць, прычым праблемы сур'ёзныя. Украіна, як, дарэчы, і Беларусь, брала ўдзел у PISA ўпершыню.

— Пасрэдны ўзровень украінскай школьнай адукацыі сведчыць аб вострай неабходнасці яе рэфармавання і працягу рэалізацыі праграмы «Новая ўкраінская школа», — заявіла **міністр адукацыі і навукі Украіны Ганна НАВАСАД**. — Вынікі PISA-2018, у прыватнасці, разбураюць міф пра эфектыўнасць савецкай матэматычнай сістэмы адукацыі. Даследаванне паказвае: 36 % нашых 15-гадовых вучняў не дасягаюць нават базавага ўзроўню ведаў па матэматыцы. У іх ёсць праблемы з задачамі, дзе трэба выкарыстоўваць простыя стратэгіі рашэння, працэнтныя суадносіны, аперыраваць дробамі і дзесятковымі лічбамі. Мы разлічваем на тое, што атрыманыя вынікі стануць сігналам для нашых настаўнікаў, бацькоў і грамадства ў цэлым. Цяпер павінна стаць відавочна, што рэформа школьнай адукацыі для Украіны —- не капрыз, а аб'ектыўная патрэба.

Па выніках справаздачы PISA, Украіна мае на 39 балаў менш па матэматыцы, на 22 балы менш па прыродазнаўчанавуковых дысцыплінах і на 23 балы менш па чытацкай адукаванасці ў параўнанні з сярэднім вынікам па краінах АЭСР (Арганізацыі па эканамічным супрацоўніцтве і развіцці).

Як вынікае са справаздачы, 15-гадовыя падлеткі ва Украіне адстаюць ад сваіх аднагодкаў у краінах АЭСР на адзін год у матэматыцы (розніца ў 30 балаў роўная аднаму году навучання). Гэта значыць, што для таго, каб іх дагнаць па балах, украінскім школьнікам трэба яшчэ год вучыцца, прычым гэта не толькі выдаткі ў часе, але і матэрыяльны рэсурс, які трэба ўкласці ў навучанне...

Базавага ўзроўню сфарміраванасці кампетэнцый ва Украіне не дасягнула па чытацкай адукаванасці 26,9 % украінскіх падлеткаў, а ў прыродазнаўчанавуковай — 26,4 %.

### АКЦЭНТ — НА КРЫТЫЧНЫ АНАЛІЗ

Здавалася б, банальнае пытанне — чаму павінны навучаць у школе? Самы відавочны адказ — канешне, ведам. Вучань павінен засвоіць пэўны набор правілаў мовы, гістарычных фактаў, фізічных законаў, матэматычных формул і гэтак далей — нібыта ўсё лагічна. Але насамрэч гэта ўчарашні дзень: сёння куды важнейшае ўменне вырашаць рэальныя жыццёвыя задачы і самастойна працаваць з інфармацыяй, выкарыстоўваць яе, напрыклад, каб сфармуляваць свой пункт гледжання ў спрэчцы аб генетычна змененых прадуктах, зразумець газетны артыкул пра глабальнае пацяпленне, разабрацца з тым, ці можна выкарыстоўваць соевы замяняльнік замест каровінага малака, раскрыць рэкламныя маніпуляцыі і г. д.

«Школы павінны рыхтаваць вучняў да беспрэцэдэнтных перамен у эканоміцы і навакольнай рэчаіснасці, да працы на рабочых месцах, якія яшчэ не створаны, да выкарыстання тэхналогій, якія не вынайдзены, — лічыць **дырэктар дэпартамента па адукацыі Арганізацыі па эканамічным супрацоўніцтве і развіцці (АЭСР), галоўны куратар PISA Андрэас ШЛЯЙХЕР**. — Актуальная становяцца разнастайныя камбінацыі ведаў, кампетэнцыі, навыкі, якія могуць прывесці да поспеху ў кар'еры. Акцэнт у сучаснай адукацыі павінен рабіцца на развіццё творчага пачатку, крытычнага аналізу, умення вырашаць праблемы і прымаць рашэнні.

Праграма PISA (Program for International Student Assessment) ужо 19 гадоў збірае звесткі аб якасці адукацыі ў свеце. Раз на тры гады яна тэсціруе 15-гадовых падлеткаў у розных краінах. Такі ўзроставы цэнз абраны невыпадкова. Фактычна паўсюдна менавіта ў гэтым узросце навучэнцы заканчваюць базавы этап адукацыі і вызначаюцца з далейшай жыццёвай і адукацыйнай траекторыяй.

Тэсты PISA, якія доўжацца дзве гадзіны, утрымліваюць тры асноўныя блокі: заданні на чытацкую адукаванасць (разуменне тэкстаў), матэматычную і прыродазнаўчанавуковую. У іх шмат тэкстаў, якія трэба ўважліва прачытаць (а для сучасных школьнікаў, якія не любяць вялікія тэксты, гэта, бадай што, самае складанае) і адказаць на шматлікія пытанні, што ідуць групамі, з прывязкай да канкрэтнага тэксту.

Арганізатары тэсту падкрэсліваюць: вынікі PISA — гэта не рэйтынг краін, а толькі спроба вызначыць, якой павінна быць самая эфектыўная адукацыйная сістэма. Апошнім даследаваннем было ахоплена 600 тысяч навучэнцаў з 79 краін і адміністрацыйных тэрыторый.




Безумоўны лідар рэйтынгу — Кітай. Праўда, даследаванне праводзілася толькі ў чатырох яго правінцыях — Пекін, Шанхай, Цзянсу і Чжэцзян, у якіх пражываюць 180 мільёнаў чалавек. У матэматыцы кітайскія школьнікі набралі 591 бал, у чытанні 555 балаў, у прыродазнаўчых навуках — 590.

Другі вынік у Сінгапура: 549 балаў у чытанні, 569 — у матэматыцы і 551 — у навуках. На трэцім месцы Макао: 525, 558 і 544 балы адпаведна. Гэта значыць, што першыя радкі занялі краіны Азіі. З краін еўрапейскага рэгіёна самая высокая пазіцыя ў Эстоніі (пятае месца ў сусветным рэйтынгу PISA). У першую дзясятку ўвайшлі таксама Канада, Фінляндыя, Ірландыя, Паўднёвая Карэя і Польшча.

### ЧЫМ ГАНАРЫМСЯ?

Цікава, што дэбютныя вынікі ўдзелу ў PISA беларускіх школьнікаў кіраўніцтва Міністэрства адукацыі ацэньвае як годныя і параўноўвае іх балы не з сярэднімі паказчыкамі па краінах АЭСР, а з усімі краінамі-ўдзельніцамі. Пры такіх падліках нашы навучэнцы насамрэч аказваюцца ў сярэдзіне спісу, але ўсё роўна ніжэй за пазіцыі Расіі, Літвы, Латвіі і тым больш Эстоніі.

Па чытацкай адукаванасці ў беларускіх падлеткаў 474 балы. Столькі ж у Ісландыі, крыху больш у Літвы, Венгрыі і Італіі (па 476 балаў), а крыху ніжэй за нас у спісе Ізраіль і Люксембург (470). Характэрна, што сярэдні паказчык усіх краін-удзельніц у гэтым кірунку — 454 балы, гэта значыць, на 20 пунктаў менш.

Па матэматычнай адукаванасці ў нашых школьнікаў 472 балы (сярэдні паказчык — 459), столькі ж у Мальты, радком вышэй — ЗША (478 балаў), а крыху ніжэй — Харватыя (464). Што датычыцца прыродазнаўчанавуковай адукаванасці, то ў беларусаў 471 бал (сярэдні — 458), трохі абагналі нас школьнікі з Харватыі (472 балы), Ісландыі (475), Люксембурга (477), затое мы напераздзе Украіны (469).

Але калі бліжэй знаёмішся з арыгіналам справаздачы па выніках PISA (https://www.oecd.org), то прыходзіш да высновы, што сярэднія балы — гэта нешта накшталт сярэдняй тэмпературы па бальніцы, якая рэальнай карціны агульнага «здароўя» (якасці адукацыі) не дае, і трэба насамрэч глядзець значна глыбей.

У PISA робіцца важныя высновы: якая колькасць вучняў здолела выканаць заданні вельмі высокага ўзроўню, а якая — не справілася нават з найпрасцейшымі. Усяго выдзяляюцца шэсць узроўняў: пяты і шосты — самыя высокія.

І вось тут высвятляецца, што толькі каля 4 % беларускіх падлеткаў маюць высокія паказчыкі ў чытанні — гэта значыць, што яны дасягнулі пятага і шостага ўзроўню ў тэсце па чытацкай адукаванасці PISA (у сярэднім па АЭСР паказчык складае 9 %). На гэтых узроўнях вучні могуць засвойваць вялікія тэксты, аперыраваць абстрактнымі паняццямі, знаходзіць парушэнні ў логіцы, адрозніваць факты ад меркаванняў, ідэнтыфікаваць крыніцы інфармацыі. Толькі 7 % беларускіх вучняў можна аднесці да «адукацыйнай эліты» па матэматыцы, што могуць рашаць заданні пятага і шостага ўзроўняў (сярэдні паказчык па АЭСР — 11 %): мадэляваць складаныя сітуацыі матэматычна, выбіраць, параўноўваць і ацэньваць адпаведныя стратэгіі вырашэння праблем. Для параўнання, у Шанхаі і Пекіне пятага і шостага ўзроўняў па матэматыцы дасягнула больш за 40 % вучняў. А 29 % беларускіх падлеткаў не рашаюць нават простыя матэматычныя задачы.

24 % нашых школьнікаў не спраўляюцца з элементарнымі фізічнымі, біялагічнымі, хімічнымі задачамі... І толькі 3 % беларускіх навучэнцаў атрымалі высокі ўзровень (пяты ці шосты) у прыродазнаўчых навуках (сярэдні паказчык па краінах АЭСР — 7 %) — гэта значыць, што яны валодаюць высокімі кампетэнцыямі, могуць творча і аўтаномна прымяняць свае прадметныя веды ў самых розных сітуацыях, у тым ліку і ў незнаёмых.

### КАРЫСНАЕ ХОБІ

Дык з чым звязаны аптымізм кіраўніцтва Міністэрства адукацыі?

«Балы вучняў беларускіх гімназій і ліцэяў супастаўныя з баламі іх аднагодкаў з Кітая, Сінгапура і Эстоніі, якія апынуліся на верхніх радках рэйтынга», — прыводзіць аргумент **дырэктар Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў Юрый МІКСЮК**. Але давайце не забываць, што яшчэ два гады таму адбор у гімназіі адбываўся на конкурснай аснове. Агульнаадукацыйныя ліцэі — таксама ўстановы адукацыі, прызначаныя для адораных дзяцей. І зусім не факт, што наступны раз беларускія гімназісты змогуць паўтарыць свае цяперашнія дасягненні.

**Але намеснік міністра адукацыі Аляксандр КАДЛУБАЙ** упэўнены, што ў даследаванні, якое пройдзе ў 2021 годзе, у Беларусі ёсць усе шанцы палепшыць свой вынік «з улікам прадуманых, узважаных і вывераных мерапрыемстваў па развіцці сістэмы агульнай сярэдняй адукацыі».

Яго аптымізм падзяляе і Юрый Міксюк: «Хацеў бы заклікаць нас усіх крытыкаваць недахопы, якія мы заўважаем, больш канструктыўна. Той вынік, які мы атрымалі і яшчэ прааналізуем, дазволіць нам знайсці найлепшае, што ёсць у лідараў. Таксама даследаванне дапаможа беларускай школе дакладней вызначыць нашы болевыя пункты. Ёсць шэраг момантаў, над якімі мы ўжо працуем і якія яшчэ будуць укараняцца ў сістэму адукацыі. У прыватнасці, гэта спецыфіка заданняў PISA, якія арыентаваныя на дзеянні ў незнаёмай сітуацыі, выкарыстанне ведаў у рэальным жыцці, заданні, якія мы называем зашумленымі (з лішкам інфармацыі). Яны павінны быць асвоены нашымі навучэнцамі...»

І напрыканцы яшчэ некалькі важных высноў з PISA. Больш высокія вынікі па чытацкай адукаванасці прадэманстравалі беларускія школьнікі з сем'яў, дзе бацькі маюць вышэйшую адукацыю — іх сярэдні вынік 514 балаў. Самы высокі бал (527) мае група навучэнцаў, якая назвала чытанне сваім хобі.

А школьнікі, якія займаюцца музыкай, дэманструюць больш высокія вынікі ў прыродазнаўчых навуках — у іх плюс 30 балаў! Значыць, маюць рацыю прыхільнікі STEAM-падыходу ў навучанні, якія сцвярджаюць, што спроба развіваць адукацыю толькі ў кірунку навукі, інжынернай справы і матэматыкі без паралельнага развіцця арт-дысцыплін можа прывесці да таго, што маладое пакаленне будзе пазбаўлена крэатыўнасці. Толькі ў адзінстве дакладных і гуманітарных навук можна выхаваць усебакова развітых спецыялістаў, вынаходнікаў і наватараў у сваёй сферы.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

**Даведка**

**АЭСР — гэта міжнародная арганізацыя эканамічна развітых краін. У яе ўваходзяць асноўныя дзяржавы Еўропы плюс Мексіка, Паўднёвая Карэя, Японія, Канада, Чылі, ЗША — усяго 36 краін свету.**

## РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «МТЗ»

**Лот № 1, состав:** 1. Здание неустановленного назначения с инв. № 500/С-44377, 1947 г. п., площадь – 102,6 кв. м. 2. Здание мастерской с инв. № 500/С-47137, 1975 г. п., площадь – 149,0 кв. м. Адрес: г. Минск, ул. Долгобродская, 22, 22/1.

**Земельный участок** с кадастровым номером 500000000001034082 площадью 0,1667 га. Целевое назначение – эксплуатация и обслуживание здания неустановленного назначения и здания специализированного иного назначения (мастерская). Право аренды, срок действия по 28.02.2024. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

Обременения: аренда здания неустановленного назначения с инв. № 500/С-44377 (102,6 кв. м) и здания мастерской с инв. № 500/С-47137 (149,0 кв. м) по 30.04.2023.

**Начальная цена** с НДС – 133 940,00 бел. руб. **Задаток** – 20 000,00 бел. руб. **Шаг аукциона** – 5 %.

Размер штрафа в соответствии с соглашением о правах и обязанностях сторон в процессе организации и проведения аукциона составляет 20 000,00 белорусских рублей

**Аніённыя паверхнева-актыўныя рэчывы (ПАР)** выкарыстоўваюць у якасці «ачышчальнікаў» у шампунях і іншых мыйных сродках (у складзе яны значацца як sodium laurylsulfate (SLS), sodium laureth sulfate (SLES). Яны выклікаюць парушэнні імунітэту, алергію, паражэнні мозгу, печані, нырак, лёгкіх.

**Фенолы і крэзолы** вельмі едкія, выклікаюць дыярэю, галавакружэнне, парушэнне функцый нырак і печані.

Кароткачасовае ўздзеянне **нафтавых дыстылятаў** можа прывесці да расстройства зроку, доўгачасовае — да парушэнняў функцыянавання нервовай сістэмы, нырак і скурных хвароб.

**Нашатырны спірт** у сродках для ачысткі шкляных паверхняў прыводзіць да раздражнення вачэй, дыхальных шляхоў, выклікае галаўныя болі.

**Фармальдэгід** — прычына моцнага раздражнення вачэй, горла, скуры, дыхальных шляхоў і лёгкіх.

**Нітрабензол** выклікае абясколерванне скуры, задышку, ірвоту, у асаблівых цяжкіх выпадках — смерць.

**Шкодныя** для дзяцей такія нафтапрадукты, як **мінеральныя маслы** (mineral oil, liquid paraffin, petrolatum liquid і іншыя).

**Парабены** — кансерванты, якія выкарыстоўваюцца ў касметыцы. Іх наяўнасць можа стаць прычынай няправільнага развіцця плода і парушэнняў рэпрадукцыйнай функцыі.

**Бісфенол-А** утрымліваецца ў таварах з пластыку, выклікае парушэнні ў эндакрыннай сістэме.

Небяспечнымі могуць стаць і тавары з перапрацаванага пластыку: кантэйнеры, канцылярскія тавары, мэбля, элементы гарадскіх збудаванняў, адзенне і абутак, пакрыццё для дарог, смеццевыя пакеты, вырабы для саду і іншае. Праблема ў тым, што новыя прадукты, створаныя з удзелам другаснай сыравіны, утрымліваюць тыя ж дабаўкі, што і зыходныя тавары (напрыклад, камп'ютары, тэлевізары і іншае электроннае і электрычнае абсталяванне), у тым ліку небяспечныя рэчывы. Трапляючы ў арганізм чалавека з перапрацаванага пластыку, многія забруджвальнікі (САЗы) здольныя паражаць рэпрадукцыйную сістэму, перашкаджаць дзеянню гармонаў, негатыўна ўплываць на разумовае развіццё, увагу, памяць у дзяцей і іншае.

## Лялька з сюрпрызам

Кожная цацка, што рэалізуецца ў нашай краіне, павінна мець сертыфікат адпаведнасці Еўразійскага эканамічнага саюза (Мытнага саюза), наяўнасць якога гарантуе адпаведнасць цацкі патрабаванням бяспекі тэхнічнага рэгламенту Мытнага саюза «Аб бяспецы цацак». Сертыфікат можа атрымаць як мясцовы, так і замежны вытворца.

— Каб атрымаць такі сертыфікат, тавар правяраецца ў акрэдытаваных лабараторыях, — расказвае **загадчык лабараторыі гігіены дзяцей і падлеткаў НПЦ гігіены Наталля ГРЭКАВА.** — Так, цацка павінна мець пэўныя арганалептычныя паказчыкі: пах у межах дапушчальных велічынь (а для маленькіх дзяцей і прысмак), не павінна выдзяляць шкодныя хімічныя рэчывы. Некаторыя цацкі даследуюцца на выдзяленне ў паветранае і воднае асяроддзе, усе на канцэнтрацыю цяжкіх металаў.

**Хімікаты ўздзейнічаюць на чалавека праз розныя каналы: насаглотку, лёгкія, скуру і раны. Яны могуць выклікаць вострую ці хранічную інтаксікацыю, здольныя біякумулявацца — збірацца ў жывых арганізмах. Некаторыя асобна ўзятыя хімікаты, якія не аказваюць адмоўнага эфекту на людзей, іншыя жывыя арганізмы і наваколле, пры іх адначасовым уздзеянні могуць «складвацца» і павялічваць сваё дзеянне.**

Праходзяць выпрабаванні такія тавары і па цэлым шэрагу фізічных фактараў: узровень напружанасці электрастатычнага і электрамагнітнага поля, узровень гуку, лакальнай вібрацыі і іншыя.

Спецыялісты таксама вывучаюць, ці можа аказваць цацка таксічнае ўздзеянне, напрыклад, выклікаць раздражненне скуры, слізістай абалонкі вока, наколькі яна бяспечная па мікрабіялагічных паказчыках. Для тавараў на мінеральнай аснове — набораў для творчасці, дзе ёсць пясок, гіпс, мел, — ацэньваюцца і радыялагічныя паказчыкі.



Касметыка для лялек можа выглядаць прывабнай і для чалавека, але нельга дапускаць яе выкарыстання дзецьмі.

Акрамя таго цацкі праходзяць выпрабаванні на трываласць, вастрыню даступных кантаў, устойлівасць (цацкі, прадугледжаныя для язды), герметычнасць (надзіманыя цацкі), узгаральнасць (мякканабіўныя і карнавальныя цацкі) і многае іншае.

Прайшоўшы ўсе праверкі, цацка атрымлівае пратаколы выпрабаванняў, затым выдаецца сертыфікат адпаведнасці.

## Купляць у інтэрнэце — шкодзіць здароўю?

Але не ўсе цацкі, якія сёння прадаюцца ў нашай краіне, маюць такія дакументы.

— Ніхто не дасць гарантыю, што цацка, купленая праз замежныя інтэрнэт-крамы AliExpress, ці ў падземным пераходзе, будзе бяспечная, — кажа Наталля Грэкава. — Таму калі бацькі вырашаюць купіць тую ці іншую цацку для свайго дзіцяці, не маючы адпаведных доказаў яе бяспекі, яны вельмі рызыкуюць.

## Як выбраць бяспечную цацку?

✓ Купляць тавары ў месцах арганізаванага гандлю.

✓ Звяртаць увагу на ўпакоўку, наяўнасць на этыкетцы ўсёй патрэбнай інфармацыі (назва цацкі, яе вытворцы, пастаўшчыка, састаў сыравіны, узроставая адрасаванасць, указанні і папярэджванні).

✓ Улічваць, для якога ўзросту прызначана цацка — для ранняга ці старэйшага. Па словах Наталлі Грэкавай, шмат трагічных выпадкаў звязана з тым, што дзеці гуляліся з цацкай, якая не адпавядала іх узросту.

✓ Пры ўзнікненні сумненняў наконт якасці і бяспечнасці цацкі можна запытаць у прадаўца сертыфікат якасці, дзе пазначана ўся важная інфармацыя пра тавар. Калі прадавец не паказвае такі дакумент, гэта павінна насцярожыць.

У якасці цацак часам прадаюцца тавары, якія на самай справе цацкамі не з'яўляюцца, напрыклад, сувенірная прадукцыя. Такія тавары не праходзяць неабходных выпрабаванняў. Не пашыраецца дзеянне тэхнічнага рэгламенту і на «цацкі» для дзяцей з 14 гадоў — напрыклад, дроны, верталёты з радыёкіраваннем ды іншае.

**Тэхрэгламент Мытнага саюза 005/2011 «Аб бяспецы ўпакоўкі» забараняе выкарыстоўваць упакоўку з другаснага пластыку для вытворчасці прадукцыі для дзяцей, напрыклад у дзіцячым харчаванні.**

Існуюць праблемы і з правільным выкарыстаннем набораў касметыкі для лялек. Яны не адносяцца да касметычных сродкаў, таму такія цені ці памаду дзіця можа наносіць толькі ляльцы на вочы, а не карыстацца імі самому. Пры гэтым касметыка для дзяцей, як і іншыя касметычныя сродкі, павінна адпавядаць тэхнічнаму рэгламенту Мытнага саюза «Аб бяспецы парфумерна-касметычнай прадукцыі».

## Ад раздражнення да праблем з дыханнем

Шкодныя хімічныя рэчывы, што ўваходзяць у састаў цацкі (напрыклад, фармальдэгід ці фенол), могуць выклікаць алергічную рэакцыю, а пры працяглым уздзеянні — стомленасць, скурныя раздражненні, праблемы з дыханнем. Чым больш такіх цацак у акружэнні дзіцяці, тым мацнейшы ўплыў аказваюць хімічныя рэчывы.

— Модныя сёння слаймы, пасты для лепкі, якія звычайна маюць доўгі кантакт са скурай, могуць выклікаць алергічныя праявы, калі ўтрыманне якога-небудзь рэчыва з яго саставу перавышае нарматыў, — кажа Наталля Грэкава. — Таму калі вы ў пераходзе купілі такую цацку, зробленую з матэрыялаў незразумелага паходжання, без указання саставу, — яе бяспеку гарантаваць немагчыма.

**Вераніка КОЛАСАВА.**

## МАРКІРОЎКА



**Раздражняльны**

Чым пагражае: пры пападанні на скуру і ў вочы можа выклікаць сверб, раздражненне і запаленне.

Як засцерагчыся: не дапускаць пападання на скуру і ў вочы, старанна мыць рукі пасля работы з рэчывам, працаваць у памяшканнях, якія добра праветрываюцца.



**Шкодны**

Чым пагражае: прадукт утрымлівае адно ці некалькі шкодных ці таксічных рэчываў.



**Едкі**

Чым пагражае: у саставу прадукту ўваходзіць шчолач ці кіслата ў вялікай канцэнтрацыі. Пры пападанні на скуру можа выклікаць цяжкія апёкі і сур'ёзныя пашкоджанні скуры і вачэй, мышачнай тканкі і слізістай абалонкі.

Як засцерагчыся: пры рабоце з такімі прадуктамі абавязкова надзяваць пальчаткі і абараняць вочы.



**Небяспека для здароўя**

Чым пагражае: у саставу могуць уваходзіць рэчывы, якія выклікаюць алергію, уплываюць на асобныя органы і выклікаюць аддаленыя наступствы.



**Небяспечны для навакольнага асяроддзя**

Чым пагражае: у саставу прадукту могуць уваходзіць рэчывы, якія ствараюць пагрозу для жыцця водных і наземных арганізмаў.

Каб вырашыць, ці можна купляць той ці іншы тавар, варта праверыць яго адсутнасць у Рэестры небяспечнай прадукцыі, забароненай да ўвозу і (ці) абарачэння на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

# РАСКЛАД РУХУ

## ЦЯГНІКОЎ РЭГІЯНАЛЬНЫХ ЛІНІЙ ЭКАНОМКЛАСА І ЦЯГНІКОЎ ГАРАДСКІХ ЛІНІЙ з 8 снежня 2019 года



### ▶ На Маладзечна, Гудагай

**Адпраўленне са станцыі МІНСК-ПАСАЖЫРСКІ**

| Станцыя прызначэння | Час адпраўлення са ст. Мінск-Пасажырскі | Час прыбыцця на канцавую станцыю | Дні курсіравання | Прыпынкі |
|---|---|---|---|---|
| Маладзечна | 00-46 | 02-26 | штодзень | б/п Татаршчызна, Селівонаўка |
| Гудагай | 04-39 | 07-40 | штодзень | б/п Мінскае Мора, Крыжоўка, Зялёнае, Хмелеўка, Анусіна, Вязынка, Пралескі |
| Маладзечна | 05-24 | 07-08 | штодзень | усюды |
| Беларусь | 05-40 | 06-14 | штодзень | усюды |
| Беларусь | 06-02 | 06-36 | штодзень | усюды |
| Гудагай | 06-25 | 09-55 | штодзень | усюды |
| Беларусь | 06-40 | 07-14 | штодзень | усюды |
| Маладзечна | 07-24 | 09-25 | штодзень | усюды |
| Беларусь | 07-45 | 08-19 | штодзень | усюды |
| Маладзечна | 08-01 | 09-50 | штодзень | б/п Мясота, Татаршчызна, Селівонаўка |
| Беларусь | 08-16 | 08-54 | штодзень | усюды |
| Беларусь | 08-35 | 09-09 | штодзень | усюды |
| Маладзечна | 08-47 | 10-39 | штодзень | усюды |
| Беларусь | 09-25 | 09-59 | штодзень | усюды |
| Солы | 09-42 | 13-05 | штодзень | усюды |
| Беларусь | 10-40 | 11-14 | штодзень | усюды |
| Маладзечна | 11-04 | 12-50 | з панядзелка па пятніцу | усюды |
| Гудагай | 11-04 | 14-29 | па суботах, нядзелях | усюды |
| Беларусь | 11-35 | 12-09 | штодзень | усюды |
| Беларусь | 12-05 | 12-39 | штодзень | усюды |
| Беларусь | 12-30 | 13-04 | штодзень | усюды |
| Маладзечна | 12-57 | 14-43 | штодзень | усюды |
| Беларусь | 13-30 | 14-04 | штодзень | усюды |
| Гудагай | 14-02 | 17-27 | штодзень | б/п Селівонаўка |
| Беларусь | 14-55 | 15-29 | штодзень | усюды |
| Маладзечна | 15-38 | 17-24 | штодзень | усюды |
| Беларусь | 16-00 | 16-34 | штодзень | усюды |
| Гудагай | 16-15 | 19-33 | штодзень | усюды |
| Беларусь | 16-30 | 17-04 | штодзень | усюды |
| Беларусь | 17-25 | 18-03 | штодзень | усюды |
| Маладзечна | 17-36 | 19-21 | штодзень | усюды |
| Беларусь | 17-50 | 18-24 | штодзень | усюды |
| Гудагай (паскораны) | 18-11 | 20-44 | штодзень | з прыпынкамі: Мінск-Паўночны, Масюкоўшчына, Лябяжы, Ждановічы, Фестывальны, ст. Маладзечна, Пруды, Заскавічы, Залессе, Маладзёжны, Смаргонь, Солы, Ашмяны, Каменка |
| Гудагай | 18-17 | 21-56 | штодзень | усюды |
| Беларусь | 18-44 | 19-20 | штодзень | усюды |
| Солы | 19-17 | 22-17 | штодзень | да ст. Маладзечна з усімі прыпынкамі, ад ст. Маладзечна з прыпынкамі: Пруды, Заскавічы, Залессе, Маладзёжны, Смаргонь |
| Беларусь | 19-43 | 20-17 | штодзень | усюды |
| Беларусь | 20-23 | 20-58 | штодзень | усюды |
| Маладзечна | 20-53 | 22-39 | штодзень | усюды |
| Маладзечна | 22-13 | 23-55 | штодзень | б/п Татаршчызна, Селівонаўка |

**Адпраўленне з п. п. МІНСК-ПАЎНОЧНЫ**

| Станцыя прызначэння | Час адпраўлення з п. п. Мінск-Паўночны | Час прыбыцця на канцавую станцыю | Дні курсіравання | Прыпынкі |
|---|---|---|---|---|
| Маладзечна (паскораны) | 05-21 | 06-47 | штодзень | б/п Мінскае Мора, Ратамка, Крыжоўка, Зялёнае, Хмелеўка, Анусіна, Вязынка, Пралескі, Раманы |

### ▶ На Асіповічы

**Адпраўленне са станцыі МІНСК-ПАСАЖЫРСКІ**

| Станцыя прызначэння | Час адпраўлення са ст. Мінск-Пасажырскі | Час прыбыцця на канцавую станцыю | Дні курсіравання | Прыпынкі |
|---|---|---|---|---|
| Пухавічы | 00-51 | 02-07 | штодзень | б/п Тэхнікум |
| Асіповічы | 05-11 | 07-12 | штодзень | б/п Чыгуначны |
| Рудзенск | 05-50 | 06-38 | штодзень | усюды |
| Асіповічы | 06-11 | 08-22 | штодзень | б/п Чыгуначны, Вярхі |
| Асіповічы | 06-46 | 09-04 | штодзень | б/п Вярхі |
| Рудзенск | 07-24 | 08-12 | штодзень | усюды |
| Пухавічы | 07-54 | 09-11 | штодзень | усюды |
| Рудзенск | 08-15 | 09-03 | штодзень | усюды |
| Асіповічы (паскораны) | 08-27 | 10-14 | штодзень | з усімі прыпынкамі да ст. Міханавічы, далей з прыпынкамі: Рудзенск, Пухавічы, Веленскі, Блужа, Майскі, Весялоўскі, Талька, Вярэйцы |
| Асіповічы | 08-56 | 11-00 | штодзень | усюды |
| Асіповічы | 10-07 | 12-26 | штодзень | усюды |
| Рудзенск | 12-58 | 13-46 | штодзень | усюды |
| Асіповічы | 13-23 | 15-31 | штодзень | усюды |
| Рудзенск | 14-00 | 14-48 | штодзень | усюды |
| Асіповічы | 14-20 | 16-36 | штодзень | усюды |
| Асіповічы | 15-12 | 17-34 | штодзень | усюды |
| Асіповічы | 16-05 | 18-19 | штодзень | усюды |
| Рудзенск | 16-35 | 17-23 | штодзень | усюды |
| Рудзенск | 17-25 | 18-13 | штодзень | усюды |
| Асіповічы | 17-40 | 19-52 | штодзень | усюды |
| Асіповічы | 18-24 | 20-38 | штодзень | б/п Вярхі |
| Асіповічы | 19-18 | 21-33 | штодзень | усюды |
| Пухавічы | 20-05 | 21-22 | штодзень | усюды |
| Асіповічы | 20-55 | 22-58 | штодзень | б/п Вярхі |
| Рудзенск | 21-30 | 22-18 | штодзень | усюды |
| Пухавічы | 22-49 | 00-06 | штодзень | усюды |

**Адпраўленне з п. п. ІНСТЫТУТ КУЛЬТУРЫ**

| Станцыя прызначэння | Адпраўленне з п. п. Інстытут Культуры | Час прыбыцця на канцавую станцыю | Дні курсіравання | Прыпынкі |
|---|---|---|---|---|
| Асіповічы | 12-28 | 14-32 | штодзень | усюды |

### ▶ На Стоўбцы, Баранавічы

**Адпраўленне са станцыі МІНСК-ПАСАЖЫРСКІ**

| Станцыя прызначэння | Час адпраўлення са ст. Мінск-Пасажырскі | Час прыбыцця на канцавую станцыю | Дні курсіравання | Прыпынкі |
|---|---|---|---|---|
| Баранавічы (паскораны) | 00-48 | 02-54 | штодзень | б/п Сталічны, Рошча, Пціч, Бярэжа, Пяцігор'е, Станькава, Клыпаўшчына, Асіна, Мезінаўка, Адцэда, Кучкуны, Цёмныя Ляды, Сінява, Асіпаўшчына, Ліпа, Хвоева, Пагарэльцы, Юшкевічы, Крошын, Альсевічы, Пост 1 |
| Баранавічы | 04-31 | 06-58 | штодзень | б/п Сталічны, Пціч, Пяцігор'е, Станькава, Клыпаўшчына, Асіна, Мезінаўка, Адцэда, Кучкуны, Цёмныя Ляды |
| Стоўбцы (паскораны) | 05-04 | 06-22 | штодзень | б/п Сталічны, Рошча, Пціч, Воўчкавічы, Бярэжа, Пяцігор'е, Станькава, Клыпаўшчына, Асіна, Мезінаўка, Адцэда, Кучкуны, Цёмныя Ляды |
| Стоўбцы | 05-56 | 07-33 | штодзень | б/п Сталічны |
| Баранавічы | 08-18 | 10-55 | штодзень | б/п Сінява, Асіпаўшчына, Вароцішча, Ліпа, Альсевічы |
| Стоўбцы | 17-50 | 19-43 | штодзень | усюды |
| Баранавічы | 20-38 | 23-21 | штодзень | б/п Сінява, Асіпаўшчына, Ліпа, Юшкевічы, Альсевічы |
| Стоўбцы | 21-43 | 23-24 | штодзень | б/п Сталічны |
| Стоўбцы | 22-29 | 00-15 | штодзень | б/п Сталічны |

**Адпраўленне з п. п. ІНСТЫТУТ КУЛЬТУРЫ**

| Станцыя прызначэння | Час адпраўлення з п. п. Інстытут Культуры | Час прыбыцця на канцавую станцыю | Дні курсіравання | Прыпынкі |
|---|---|---|---|---|
| Баранавічы | 07-10 | 10-03 | штодзень | усюды |
| Баранавічы | 08-49 | 11-41 | з панядзелка па чацвер | усюды |
| Стоўбцы | 08-49 | 10-23 | з пятніцы па нядзелю | усюды |
| Стоўбцы | 09-48 | 11-22 | з панядзелка па чацвер | усюды |
| Баранавічы | 09-48 | 12-31 | з пятніцы па нядзелю | усюды |
| Баранавічы | 11-31 | 14-23 | з пятніцы па нядзелю | усюды |
| Стоўбцы | 12-44 | 14-29 | штодзень | усюды |
| Баранавічы | 13-45 | 16-42 | штодзень | усюды |
| Гарадзея | 14-46 | 16-46 | штодзень | усюды |
| Стоўбцы | 15-44 | 17-41 | штодзень | усюды |
| Баранавічы | 16-23 | 19-08 | штодзень | б/п Мезінаўка, Кучкуны |
| Баранавічы | 16-57 | 20-20 | штодзень | усюды |
| Баранавічы | 18-46 | 21-40 | штодзень | усюды |
| Стоўбцы | 19-57 | 21-40 | штодзень | усюды |

### ▶ На Барысаў, Оршу

**Адпраўленне са станцыі МІНСК-ПАСАЖЫРСКІ**

| Станцыя прызначэння | Час адпраўлення са ст. Мінск-Пасажырскі | Час прыбыцця на канцавую станцыю | Дні курсіравання | Прыпынкі |
|---|---|---|---|---|
| Барысаў | 00-24 | 02-02 | штодзень | б/п Дамашаны, Барсукі, Пралетарская Перамога |
| Орша | 05-00 | 08-39 | штодзень | б/п Слабада, Дамашаны, Загор'е |
| Барысаў (паскораны) | 05-30 | 06-46 | штодзень | з прыпынкамі: Мінск-Усходні, Трактарны, Сцяпянка, Смалявічы, Зарэчнае, Чырвоны Сцяг, Жодзіна-Паўднёвае, Жодзіна, Печынскі |
| Смалявічы | 07-16 | 08-06 | штодзень | усюды |
| Барысаў (паскораны) | 08-42 | 10-00 | штодзень | з прыпынкамі: Мінск-Усходні, Трактарны, Сцяпянка, Смалявічы, Зарэчнае, Чырвоны Сцяг, Жодзіна-Паўднёвае, Жодзіна, Печынскі |
| Смалявічы | 09-35 | 10-25 | штодзень | усюды |
| Барысаў (паскораны) | 12-00 | 13-18 | з пятніцы па нядзелю | з прыпынкамі: Мінск-Усходні, Трактарны, Сцяпянка, Смалявічы, Зарэчнае, Чырвоны Сцяг, Жодзіна-Паўднёвае, Жодзіна, Печынскі |
| Смалявічы | 13-20 | 14-10 | штодзень | усюды |
| Барысаў (паскораны) | 16-53 | 18-11 | штодзень | з прыпынкамі: Мінск-Усходні, Трактарны, Сцяпянка, Смалявічы, Зарэчнае, Чырвоны Сцяг, Жодзіна-Паўднёвае, Жодзіна, Печынскі |
| Барысаў | 17-09 | 18-46 | штодзень | усюды |
| Смалявічы | 18-08 | 18-58 | штодзень | усюды |
| Барысаў (паскораны) | 21-42 | 22-59 | штодзень | з прыпынкамі: Мінск-Усходні, Трактарны, Смалявічы, Зарэчнае, Чырвоны Сцяг, Жодзіна-Паўднёвае, Жодзіна, Печынскі |

**Адпраўленне са станцыі МІНСК-УСХОДНІ**

| Станцыя прызначэння | Час адпраўлення са ст. Мінск-Усходні | Час прыбыцця на канцавую станцыю | Дні курсіравання | Прыпынкі |
|---|---|---|---|---|
| Крупкі | 05-42 | 08-16 | штодзень | усюды |
| Барысаў | 08-57 | 10-28 | штодзень | усюды |
| Орша | 10-34 | 14-33 | штодзень | усюды |
| Орша | 12-58 | 16-57 | штодзень | усюды |
| Орша | 16-02 | 20-02 | штодзень | усюды |
| Барысаў | 22-29 | 23-59 | штодзень | усюды |

**Адпраўленне з п. п. ІНСТЫТУТ КУЛЬТУРЫ**

| Станцыя прызначэння | Час адпраўлення з п. п. Інстытут Культуры | Час прыбыцця на канцавую станцыю | Дні курсіравання | Прыпынкі |
|---|---|---|---|---|
| Орша | 06-26 | 10-53 | штодзень | усюды |
| Барысаў | 07-48 | 09-28 | штодзень | усюды |
| Орша | 14-42 | 18-56 | штодзень | усюды |
| Барысаў | 17-41 | 19-19 | штодзень | усюды |
| Орша | 18-49 | 22-48 | штодзень | б/п Выдзершчына, Пераволачны, Галашоўка, Дзятлава, Ламачына |
| Барысаў | 19-34 | 21-22 | штодзень | усюды |
| Барысаў | 20-22 | 22-10 | штодзень | усюды |

## З Маладзечна

### Прыбыццё на станцыю МІНСК-ПАСАЖЫРСКІ

| Станцыя адпраўлення | Час адпраўлення з пачатковай станцыі | Час прыбыцця на ст. Мінск-Пасажырскі | Дні курсіравання | Прыпынкі |
|---|---|---|---|---|
| Маладзечна | 04-06 | 06-01 | штодзень | б/п Селівонаўка |
| ● Беларусь | 05-40 | 06-15 | штодзень | усюды |
| Маладзечна | 05-08 | 06-57 | штодзень | усюды |
| ● Беларусь | 06-27 | 07-04 | штодзень | усюды |
| Маладзечна | 05-33 | 07-23 | з панядзелка па пятніцу | усюды |
| Гудагай | 04-12 | 07-34 | штодзень | усюды |
| ● Беларусь | 07-25 | 08-00 | штодзень | усюды |
| ● Беларусь | 07-34 | 08-11 | штодзень | усюды |
| Гудагай (паскораны) | 05-35 | 08-26 | штодзень | з прыпынкамі: Фестывальны, Ждановічы, Лябяжы, Масюкоўшчына, Мінск-Паўночны |
| Маладзечна | 06-48 | 08-45 | штодзень | усюды |
| ● Беларусь | 08-28 | 09-03 | штодзень | усюды |
| Маладзечна | 07-34 | 09-23 | штодзень | усюды |
| ● Беларусь | 09-03 | 09-39 | штодзень | усюды |
| ● Беларусь | 09-45 | 10-20 | штодзень | усюды |
| Маладзечна | 09-12 | 11-14 | штодзень | усюды |
| ● Беларусь | 10-48 | 11-23 | штодзень | усюды |
| Гудагай | 08-34 | 11-34 | штодзень | б/п Раманы, Пралескі, Вязынка, Анусіна, Хмелеўка, Зялёнае, Мінскае Мора |
| Маладзечна | 10-20 | 12-08 | штодзень | усюды |
| ● Беларусь | 11-45 | 12-20 | штодзень | усюды |
| Маладзечна | 10-55 | 12-42 | штодзень | усюды |
| ● Беларусь | 12-35 | 13-10 | штодзень | усюды |
| ● Беларусь | 13-05 | 13-40 | штодзень | усюды |
| ● Беларусь | 13-40 | 14-15 | штодзень | усюды |
| Маладзечна | 13-01 | 14-50 | з панядзелка па пятніцу | усюды |
| ● Беларусь | 14-35 | 15-10 | штодзень | усюды |
| Солы | 13-35 | 16-41 | штодзень | усюды |
| ● Беларусь | 16-25 | 17-00 | штодзень | усюды |
| ● Беларусь | 16-45 | 17-20 | штодзень | усюды |
| Маладзечна | 15-58 | 17-47 | штодзень | усюды |
| ● Беларусь | 17-25 | 18-00 | штодзень | усюды |
| Маладзечна | 16-37 | 18-35 | з панядзелка па пятніцу | усюды |
| Гудагай | 15-13 | 18-35 | па суботах, нядзелях | усюды |
| ● Беларусь | 18-18 | 18-53 | штодзень | усюды |
| Маладзечна | 17-29 | 19-28 | штодзень | усюды |
| ● Беларусь | 19-06 | 19-41 | штодзень | усюды |
| Беларусь | 20-01 | 20-36 | штодзень | усюды |
| Гудагай | 17-55 | 21-06 | штодзень | усюды |
| Маладзечна (паскораны) | 19-50 | 21-18 | штодзень | б/п Селівонаўка, Крыніца, Татаршчызна, Мясота, Ласі, Баяры, Раманы, Пралескі, Вязынка, Анусіна, Хмелеўка, Зялёнае, Крыжоўка, Мінскае Мора |
| ● Беларусь | 20-50 | 21-25 | штодзень | усюды |
| ● Беларусь | 21-15 | 21-49 | штодзень | усюды |
| Маладзечна | 20-33 | 22-28 | штодзень | усюды |
| Гудагай (паскораны) | 20-02 | 22-38 | штодзень | з прыпынкамі: Каменка, Ашмяны, Солы, Гаўці, Смаргонь, Маладзёжны, Залессе, Заскавічы, Пруды, Маладзечна, Фестывальны, Ждановічы, Лябяжы, Масюкоўшчына, Мінск-Паўночны |
| Гудагай | 21-00 | 23-58 | штодзень | б/п Скрэсціны, Гаўці, Беласельскі, Заскавічы, Мароські, Асаноўскі, Раманы, Пралескі, Хмелеўка, Зялёнае, Крыжоўка |

### Прыбыццё на станцыю МІНСК-ПАЎНОЧНЫ

| Станцыя прызначэння | Адпраўленне з п. п. Мінск-Паўночны | Час прыбыцця на канцавую станцыю | Дні курсіравання | Прыпынкі |
|---|---|---|---|---|
| Гудагай | 10-29 | 13-54 | па суботах, нядзелях | усюды |

## З Асіповіч

### Прыбыццё на станцыю МІНСК-ПАСАЖЫРСКІ

| Станцыя адпраўлення | Час адпраўлення з пачатковай станцыі | Час прыбыцця на ст. Мінск-Пасажырскі | Дні курсіравання | Прыпынкі |
|---|---|---|---|---|
| Пухавічы | 04-53 | 06-10 | штодзень | усюды |
| Пухавічы | 05-42 | 06-59 | штодзень | усюды |
| ● Рудзенск | 06-19 | 07-07 | з панядзелка па пятніцу | усюды |
| Асіповічы | 05-20 | 07-22 | штодзень | б/п Вярхі |
| Пухавічы | 06-18 | 07-35 | з панядзелка па пятніцу | усюды |
| ● Рудзенск | 06-54 | 07-42 | штодзень | усюды |
| Асіповічы | 05-58 | 08-10 | штодзень | усюды |
| Пухавічы | 06-56 | 08-26 | з панядзелка па пятніцу | усюды |
| ● Рудзенск | 08-25 | 09-13 | штодзень | усюды |
| Асіповічы | 07-33 | 09-36 | штодзень | усюды |
| ● Рудзенск | 10-42 | 11-30 | штодзень | усюды |
| Асіповічы | 11-16 | 13-18 | штодзень | усюды |
| Асіповічы | 12-17 | 14-30 | штодзень | усюды |
| ● Рудзенск | 13-57 | 14-42 | штодзень | усюды |
| ● Рудзенск | 15-30 | 16-15 | штодзень | усюды |
| Асіповічы | 15-10 | 17-20 | штодзень | усюды |
| Асіповічы | 15-40 | 17-51 | штодзень | усюды |
| Асіповічы | 16-25 | 18-39 | штодзень | б/п Вярхі |
| ● Рудзенск | 18-00 | 18-48 | штодзень | усюды |
| Асіповічы | 17-17 | 19-30 | штодзень | усюды |
| ● Рудзенск | 19-11 | 19-59 | штодзень | усюды |
| Асіповічы | 18-14 | 20-17 | штодзень | б/п Вярхі |
| Асіповічы | 19-11 | 21-14 | штодзень | усюды |
| Асіповічы | 20-07 | 22-11 | штодзень | б/п Вярхі, Вяндзеж, Новае Сяло,Чыгуначны |
| Пухавічы | 21-43 | 23-10 | штодзень | усюды |
| Асіповічы (паскораны) | 21-57 | 23-42 | штодзень | з прыпынкамі: Талька, Весялоўскі, Майскі, Блужа, Веленскі, Пухавічы, Рудзенск, Міханавічы |

### Прыбыццё на п. п. ІНСТЫТУТ КУЛЬТУРЫ

| Станцыя адпраўлення | Час адпраўлення з пачатковай станцыі | Час прыбыцця на п. п. Інстытут Культуры | Дні курсіравання | Прыпынкі |
|---|---|---|---|---|
| Асіповічы (паскораны) | 08-25 | 10-25 | штодзень | б/п Вярхі, Весялоўскі, Майскі, Блужа, Веленскі, Тэхнікум, Вяндзеж, Дрычын, Новае Сяло |
| Пухавічы | 11-23 | 12-43 | штодзень | усюды |
| Асіповічы | 13-58 | 16-03 | штодзень | усюды |

## З Баранавіч

### Прыбыццё на станцыю МІНСК-ПАСАЖЫРСКІ

| Станцыя адпраўлення | Час адпраўлення з пачатковай станцыі | Час прыбыцця на ст. Мінск-Пасажырскі | Дні курсіравання | Прыпынкі |
|---|---|---|---|---|
| Стоўбцы | 04-07 | 05-45 | штодзень | усюды |
| Стоўбцы | 05-35 | 07-12 | штодзень | усюды |
| Стоўбцы | 08-14 | 10-00 | штодзень | б/п Цёмныя Ляды, Мезінаўка, Асіна |
| Стоўбцы | 15-34 | 17-22 | штодзень | усюды |
| Гарадзея | 17-10 | 19-37 | штодзень | б/п Вароцішча, Асіпаўшчына, Сінява |
| Баранавічы | 17-52 | 20-37 | штодзень | усюды |
| Стоўбцы | 20-22 | 22-09 | штодзень | усюды |
| Баранавічы (паскораны) | 22-24 | 00-29 | штодзень | з прыпынкамі: Гарадзея, Стоўбцы, Коласава, Негарэлае, Койданава, Фаніпаль, Пасыслішча, Рошча, Курасоўшчына, Сталічны |

### Прыбыццё на п. п. ІНСТЫТУТ КУЛЬТУРЫ

| Станцыя адпраўлення | Час адпраўлення з пачатковай станцыі | Час прыбыцця на п. п. Інстытут Культуры | Дні курсіравання | Прыпынкі |
|---|---|---|---|---|
| Стоўбцы | 05-16 | 06-51 | штодзень | усюды |
| Баранавічы | 04-57 | 07-36 | штодзень | б/п Пост 1, Юшкевічы, Ліпа, Кучкуны, Адцэда |
| Стоўбцы | 06-40 | 08-17 | штодзень | усюды |
| Баранавічы (паскораны) | 06-25 | 08-39 | штодзень | б/п Альсевічы, Юшкевічы, Ліпа, Асіпаўшчына, Сінява, Цёмныя Ляды, Кучкуны, Адцэда, Мезінаўка, Асіна, Клыпаўшчына, Станькава, Пяцігор'е, Бярэжа, Воўчкавічы, Пціч |
| Баранавічы | 07-38 | 10-24 | штодзень | б/п Кучкуны, Адцэда |
| Баранавічы | 08-26 | 11-24 | штодзень | усюды |
| Стоўбцы | 11-53 | 13-38 | з пятніцы па нядзелю | усюды |
| Стоўбцы | 12-35 | 14-10 | з панядзелка па чацвер | усюды |
| Баранавічы | 11-27 | 14-10 | з пятніцы па нядзелю | б/п Ліпа, Вароцішча, Асіпаўшчына, Сінява, Сталічны |
| Баранавічы | 13-07 | 15-49 | штодзень | усюды |
| Баранавічы | 14-56 | 17-53 | штодзень | усюды |
| Баранавічы | 15-52 | 18-18 | штодзень | б/п Ліпа, Асіпаўшчына, Сінява, Кучкуны, Адцэда, Мезінаўка, Асіна |
| Стоўбцы | 19-18 | 21-03 | штодзень | усюды |
| Баранавічы | 20-32 | 23-16 | штодзень | б/п Цёмныя Ляды, Кучкуны, Адцэда, Мезінаўка, Асіна, Бярэжа |

## З Оршы

### Прыбыццё на станцыю МІНСК-ПАСАЖЫРСКІ

| Станцыя адпраўлення | Час адпраўлення з пачатковай станцыі | Час прыбыцця на ст. Мінск-Пасажырскі | Дні курсіравання | Прыпынкі |
|---|---|---|---|---|
| ● Смалявічы | 06-15 | 07-03 | штодзень | усюды |
| Барысаў (паскораны) | 06-30 | 07-40 | штодзень | з прыпынкамі: Печынскі, Жодзіна-Паўднёвае, Зарэчнае, Сцяпянка, Трактарны, Мінск-Усходні |
| Барысаў | 06-37 | 08-14 | штодзень | усюды |
| Орша (паскораны) | 05-05 | 08-22 | штодзень | б/п Хараброва, Веравойша, Ламачына, Сонечны, Дзятлава, Галашоўка, Пераваланы, Выдзершчына, Пралетарская Перамога, Барсукі, Загор'е, Дамашаны, Слабада, Гарадзішча, Садовы, Калодзішчы, Азярышча |
| ● Смалявічы | 08-15 | 09-03 | штодзень | усюды |
| ● Смалявічы | 10-55 | 11-43 | штодзень | усюды |
| Барысаў (паскораны) | 10-40 | 11-57 | штодзень | з прыпынкамі: Печынскі, Жодзіна-Паўднёвае, Жодзіна, Чырвоны Сцяг, Зарэчнае, Смалявічы, Сцяпянка, Трактарны, Мінск-Усходні |
| Барысаў (паскораны) | 14-20 | 15-38 | з пятніцы па нядзелю | з прыпынкамі: Печынскі, Жодзіна-Паўднёвае, Жодзіна, Чырвоны Сцяг, Зарэчнае, Смалявічы, Сцяпянка, Трактарны, Мінск-Усходні |
| ● Смалявічы | 15-10 | 15-58 | штодзень | усюды |
| Орша | 12-48 | 16-38 | штодзень | усюды |
| Барысаў (паскораны) | 18-50 | 20-08 | штодзень | з прыпынкамі: Печынскі, Жодзіна-Паўднёвае, Жодзіна, Чырвоны Сцяг, Зарэчнае, Смалявічы, Сцяпянка, Трактарны, Мінск-Усходні |
| ● Смалявічы | 19-35 | 20-23 | штодзень | усюды |
| Орша | 20-22 | 00-22 | штодзень | б/п Пралетарская Перамога, Барсукі, Дамашаны, Слабада, Садовы |

### Прыбыццё на п. п. ІНСТЫТУТ КУЛЬТУРЫ

| Пачатковая станцыя | Час адпраўлення з пачатковай станцыі | Час прыбыцця на п. п. Інстытут Культуры | Дні курсіравання | Прыпынкі |
|---|---|---|---|---|
| Барысаў | 04-16 | 05-54 | штодзень | усюды |
| Барысаў | 05-00 | 06-45 | штодзень | усюды |
| Барысаў | 07-07 | 08-56 | штодзень | усюды |
| Орша | 08-53 | 12-42 | штодзень | усюды |
| Крупкі | 08-28 | 10-53 | штодзень | усюды |
| Орша | 08-55 | 12-45 | штодзень | усюды |
| Орша | 13-48 | 17-53 | штодзень | усюды |
| Барысаў (паскораны) | 17-17 | 18-36 | штодзень | з прыпынкамі па п. п. Печынскі, Жодзіна-Паўднёвае, Зарэчнае, Сцяпянка, Трактарны, ст. Жодзіна, Чырвоны Сцяг, Смалявічы, Сцяпянка, Мінск-Усходні |
| Орша | 15-36 | 19-45 | штодзень | усюды |
| Барысаў | 19-20 | 20-57 | штодзень | усюды |
| Барысаў | 20-32 | 22-08 | штодзень | усюды |

### Прыбыццё на станцыю МІНСК-УСХОДНІ

| Станцыя адпраўлення | Час адпраўлення з пачатковай станцыі | Час прыбыцця на ст. Мінск-Усходні | Дні курсіравання | Прыпынкі |
|---|---|---|---|---|
| Барысаў | 05-40 | 07-14 | з панядзелка па пятніцу | усюды |
| Орша | 05-44 | 10-01 | штодзень | усюды |
| Барысаў | 12-10 | 13-47 | штодзень | усюды |
| Орша | 17-28 | 21-31 | штодзень | б/п Трацілава, Пралетарская Перамога, Барсукі, Загор'е |

● – цягнік гарадскіх ліній

# ВЯРТАННЕ ІМЁНАЎ

**Ахвяр, якіх дастаўлялі ў канцлагер Штутгаф на тэрыторыі Польшчы, пазбаўлялі ўсяго. Спачатку ў іх забіралі прыватныя рэчы, а пасля — імя. Пісар пазначаў іх прозвішчы ў спецыяльную кнігу. Калі ў рэгістрацыйны барак уваходзіў чалавек, то ўжо з наступных дзвярэй выходзіў нумар. Гэтыя лічбы ахвяры павінны былі ведаць на нямецкай мове. Былыя вязні і сёння не могуць іх забыць, але вельмі не хочуць пра гэта згадваць. Работа ж па вяртанні адабраных імёнаў не спыняецца і праз столькі гадоў пасля вайны.**


Агароджа канцлагера. Вязні называлі яе «варотамі смерці».

У музеі, створаным на месцы лагера смерці, захоўваецца багаты архіў. Дзякуючы сабраным дакументам удалося аднавіць 80 працэнтаў імёнаў зняволеных. Крыніца звестак можа быць розная — запіс у рэгістрацыйнай кнізе, папкі з асабістымі справамі, дакументы з лагернага шпіталя ці якія датычыліся перавозкі зняволеных. Акрамя палякаў, тут было многа вязняў з усходу: беларусаў, рускіх, украінцаў.


Сваякі ставяць шыльды на брацкіх магілах.

## ПАМЕР УСЁЙ ЕЎРОПЫ

Гэта быў першы канцэнтрацыйны лагер па-за межамі Трэцяга рэйха і рэкардсмен па працягласці існавання — з другога верасня 1939 да 9 мая 1945 года. Ужо ў першыя дні пасля нападзення Гітлера на Савецкі Саюз сюды сталі прывозіць ваеннапалонных Чырвонай Арміі, палітвязняў, людзей, якія дапамагалі партызанам, — гэта маглі быць як асобныя грамадзяне, так і цэлыя вёскі. У Штутгаф таксама адпраўлялі на «перавыхаванне» асоб, якія былі вывезеныя як дармавая рабочая сіла, але ўхіляліся ад работ альбо «ленаваліся», дрэнна выконвалі сваю справу. У 1944 годзе тут ужо былі вязні розных нацыянальнасцяў з 25 краін свету: яўрэі, італьянцы, французы, чэхі, шведы і іншыя. Усяго праз лагер прайшло 110 тысяч чалавек, 65 тысяч было знішчана.

Сёння ў музейшчыкаў шмат работы — нашчадкі працягваюць шукаць звесткі пра сваіх блізкіх. Трэба быць уважлівымі пры рабоце з дакументамі, улічваць, што рускія і беларускія прозвішчы маглі быць выкладзены на нямецкай мове з памылкамі.

Музей цяпер займае толькі адну шостую той тэрыторыі, дзе некалі быў канцлагер. Захаваліся аўтэнтычныя будынкі. Прызначэнне аднаго з іх невядома да гэтага часу — сёння тут за шкляной вітрынай захоўваюцца рэшткі абутку, якія застала пасля вызвалення польскіх тэрыторый камісія па ўстанаўленні і расследаванні злачынстваў нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

На тэрыторыі лагера ў вялізныя кучы было звалена каля паўмільёна пар абутку, сярод якіх можна было заўважыць і чаравічкі на вельмі маленькія дзіцячыя ножкі. Відаць, такія «трафеі» сюды звозіліся з іншых лагераў для рамонту — у Штутгафе працавалі абутковыя майстэрні. Таксама вязні былі задзейнічаны на лесапільні і выкарчоўцы лесу, на цагельным заводзе, у гаспадароў на полі, у майстэрнях, якія выраблялі адзенне і розныя рэчы для нямецкай арміі.

Самім жа работнікам выдавалася паласатая «ўніформа». Нельга было паскардзіцца, што нешта парвалася, знасілася, стала бруднае, — усё выдавалася раз і назаўсёды.

Спачатку вязні спалі на саломе, раскіданай на падлозе. Пазней, каб размежаваць прастору і хоць крыху стрымліваць хваробы, якія імгненна распаўсюджваліся, тут змясцілі трохпавярховыя нары. Але баракі былі перапоўненыя, на кожным ярусе размяшчалася па некалькі чалавек, людзі спалі седзячы, абапіраючыся адно аднаму на спіны.

200 грамаў хлеба, кубак мутнай кавы, міска супу з нейкай гнілі і костак ад рыбы — такі быў рацыён вязняў. Цела адной з ахвяр пасля смерці было ўзважана і апісана — жанчына важыла 19 кілаграмаў...

Голад, хваробы, цкаванне сабакамі, смяротныя ўколы ў вобласць сэрца, газавая камера і крэматорыі... Штутгаф забраў тысячы жыццяў. Але пазбаўленыя імёнаў вязні хацелі заставацца людзьмі. Нелегальна, на выкрадзеных кавалках паперы крэйдамі ці алоўкамі яны стваралі малюнкі альбо прасілі зняволеных мастакоў напісаць з іх слоў партрэты блізкіх. Захоўваюцца ў музеі і малюнкі, зробленыя беларускімі дзеткамі, — на іх дамкі, кветкі і выведзены дзіцячай рукой подпіс: «Дарога дадому». Малыя (найстарэйшаму дзіцяці было 14 гадоў) трапілі ў лагер у 1944 годзе. Іх трымалі ў асобным бараку і каля месяца з яго не выпускалі. Цішком зняволеныя жанчыны лагера, каб падтрымаць дзяцей, дзяліліся з імі ежай, перадавалі лялькі, зробленыя з кавалкаў тканіны, паперу і алоўкі. У сакавіку 1944 года дзетак са Штутгафа вывезлі. Ёсць меркаванне, што малых маглі транспартаваць у Германію на анямечванне...

## ЯНЫ НЕ ЗМАГЛІ ВЯРНУЦЦА...

У межах візіту, арганізаванага Пасольствам Рэспублікі Польшча для беларускіх журналістаў, мне давялося наведаць найбуйнейшы мемарыял савецкіх воінаў, якія загінулі падчас вызвалення Польшчы ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1944—1945 гадах. Тут знайшлі апошні прытулак каля 22 тысяч салдат і афіцэраў Першага Беларускага фронту, якіх звозілі з розных месцаў у ваколіцах Варшавы.

Калі падчас раскопак нават у нашы дні ў Польшчы яшчэ знаходзяць парэшткі чырвонаармейцаў, якія загінулі на гэтых землях у гады Другой сусветнай вайны, іх вязуць на гэтыя мемарыяльныя могілкі ў Варшаве на перапахаванне. Мемарыял, узведзены яшчэ савецкай уладай у канцы 1940-х гадоў, натуральна, патрабаваў рамонту, які летась тут быў праведзены. Устаноўлена відэакамера, каб сачыць за парадкам на гэтай тэрыторыі.

Калі на месцы пахавання афіцэраў размешчаны пліты з прозвішчамі, то на магілах простых салдат імён не пазначалі, — на іх цяпер усталяваны бетонныя слупкі з чырвонымі зоркамі. У кожнай яме — звыш дзесятка чалавек. Але ніхто не забыты. На некаторых магілах можна ўбачыць невялікія шыльды ці пліты з прозвішчамі і фатаграфіямі — іх устанавілі сваякі, якія прыязджалі да сваіх бацькоў, дзядоў з розных куткоў былога Саюза. На адной з такіх брацкіх магіл знаходжу шыльду з фатаграфіяй нашага суайчынніка з Маларыты — Івана Паўлавіча Холада, які загінуў у верасні 1944 года. «Насамрэч на такія пабудовы павінна брацца згода ў ваяводы, але калі сваякі ставяць помнікі, мы іх не чапаем. Людзі ж праехалі столькі кіламетраў! — расказвае **ўпаўнаважаны Польскага таварыства ветэранаў і рэпрэсаваных Пётр АЛЕНЬЧАК.** — Часам мне тэлефануюць і пытаюцца, у якой магіле пахаваны той ці іншы салдат. Трэба аблегчыць іх пошукі. У мяне 22 тысячы прозвішчаў пахаваных тут вайскоўцаў на паперы, але я хачу, каб яны з'явіліся на сцяне, на спецыяльнай шыльдзе».

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**



## УВАГА: пошукі працягваюцца

Работа па вяртанні імёнаў і памяці вядзецца і ў іншых краінах. Раней «Звязда» ўжо друкавала спісы ахвяр, знішчаных на расстрэльным полі Хебертсгаўзен, якое знаходзіцца за два кіламетры ад канцлагера Дахау. Адгукнулася некалькі беларускіх сем'яў, якія знайшлі ў спісах прозвішчы сваіх родных, дзве з іх змаглі з'ездзіць у Германію і ўскласці кветкі на магілы родных. А цяпер у рэдакцыю прыйшоў новы запыт. **Генеральнае консульства Рэспублікі Беларусь у горадзе Мюнхене шукае інфармацыю, якая магла б праліць святло на лёсы паходзячых з Беларусі вязняў канцэнтрацыйных лагераў, ваеннапалонных і людзей, вывезеных на прымусовыя работы, якія загінулі на тэрыторыі Германіі ў гады Другой сусветнай вайны.** Адным з месцаў, дзе маглі быць пахаваны грамадзяне Беларусі, з'яўляюцца Мюнхенскія могілкі «Ам Перлахер Форст», на якіх знаходзяцца тры мемарыялы часоў Другой сусветнай вайны. Першы мемарыял з абагуленай назвай «Перамешчаныя асобы» з'яўляецца месцам пахавання ахвяр, вывезеных у Германію на прымусовыя работы, а таксама іншых перамешчаных асоб і бежанцаў. Усяго ў гэтым месцы пахаваны 1192 чалавекі — з Савецкага Саюза, Польшчы, Балгарыі, Венгрыі, Румыніі, Грэцыі, Турцыі, Францыі, Бельгіі і Нідэрландаў. Другі мемарыял — месца памяці аб ахвярах канцэнтрацыйных лагераў. Тут пахаваны урны з прахам 4092 вязняў. У 1950 годзе кіраўніцтва Мюнхена прыняло рашэнне перанесці сюды урны з прахам ахвяр канцлагераў з іншых гарадскіх могілак і заснаваць мемарыял. Тут пахаваны жыхары Савецкага Саюза, Германіі, Аўстрыі, Чэхіі, Польшчы, Францыі і Нідэрландаў. Трэці мемарыял прысвечаны 94 вязням турмы «Штадэльхайм» горада Мюнхена, якія былі пакараны смерцю па палітычных матывах.

Па запыце Генконсульства ад кіраўніцтва могілак «АМ Перлахер Форст» былі атрыманы спісы пахаваных ахвяр. Сярод іх шэраг імёнаў асоб, якія нарадзіліся на тэрыторыі сучаснай Беларусі. Звяртаем вашу ўвагу, што інфармацыя ў спісах няпоўная, прозвішчы некаторых ахвяр за ваенным часам маглі скажацца. Калі вы знойдзеце тут сваіх блізкіх, просьба звязацца з рэдакцыяй. Важна вярнуць памяць пра гэтых людзей — каштоўныя любыя звесткі, у тым ліку ўспаміны пра ахвяр, фатаграфіі, дакументы. Сёння даследчыкам цікавы не толькі імёны, але і лёсы людзей.

1. Дудкіна Клаўдзія (дата і месца нараджэння: 24.12.1916. Podbudsie (Рагачоўскі раён?).
2. Грыгарэнка Дзмітрый (45 гадоў. Гомель).
3. Грынчанка Уладзімір (21.12.1923. Гарадзішча (Баранавіцкі, Мінскі раён?).
4. Ілінскіс Антонія (19.05.1891. Мінск).
5. Koltumjuk Anastas (Калтумюк Анастас) (1883. Камянец).
6. Кавалёнак Іван (27.05.1929. Рагачоў).
7. Кузніцкі Тэадор (Фёдар?) (01.06.1923. Навасады).
8. Панас Яўген (10.01.1924. Ваўкавыск).
9. Пахворын Максім (11.11.1905(?). Камянец).
10. Покшыц Дзмітрый (15.08.1927. Мінск).
11. Панурк Мікола (02.10.1924. Goroditschi (Гародзічы, Калінкавіцкі раён?).
12. Самсон Надзя (26.07.1926. Пінск).
13. Збрусінскі Адам (30.09.1884(?). Магілёў).
14. Селявончук Мікалай (83 гады. Slonin (Слонім?).
15. Вінаградава Ксеніа (57 гадоў. Шуўры, Віцебск).
16. Шаткоўскі Антон (05.11.1921. Масты).
17. Славінскі Георг (23.04.1896. Чэрыкаў).
18. Надзейка Мячыслаў (27.08.1911. Гродна).
19. Ліпіна Віктар (27.11.1904. Руда (Навагрудскі раён?).
20. Кубінскі Станіслаў (19.04.1888. Канстанцінава (Мядзельскі раён?).
21. Glowacki Mierzisl (Главацкі Мячыслаў?) (23.11.1889. Астравец).
22. Фяльчынскі Андрэй (10.11.1922. Падлессе (Стаўбцоўскі, Жабінкаўскі, Быхавіцкі, Ляхавіцкі раён).
23. Дуберм Пётр (22.05.1902. Волька (Івацэвіцкі раён?).
24. Чэчуковіч Казімір (05.01.1900. Іванкі (Брагінскі раён?).
25. Байка Міхаіл (17.09.1912. Паўловічы (Круглянскі раён?).

# КАРА́ЛІ ДЛЯ ЁЛКІ

**У адной з зал Нацыянальнага гістарычнага музея распушылі штучныя лапы розныя ёлкі: у стрыманых белых і класічных чырвона-залатых колерах, у сціплых белых і блакітных шарыках і ў стракатым савецкім рэтра-стылі. А яшчэ тут некалькі соцень ёлачных цацак з усіх куткоў свету, галерэя Дзядоў Марозаў, інтэрактыўны калядны гарадок, міні-кірмаш і майстар-клас па роспісе навагодніх цацак. Усё гэта — часткі выставачнага праекта «Музей ёлачных цацак», які пачаў сваю работу 6 снежня.**



Асновай экспазіцыі, зладжанай па прынцыпе магічнага лабірынта гісторыі шкляных ёлачных цацак ад сярэдзіны XIX стагоддзя да нашых дзён, стала прыватная калекцыя сталічнага прадпрымальніка. Сярод экспанатаў ёсць сапраўдныя рарытэты — напрыклад, дакладная копія цацкі, падоранай Папу Рымскаму Іаану Паўлу II і занесенай у Кнігу рэкордаў Гінеса як самая вялікая зробленая ўручную ёлачная цацка, альбо вялізны сярэбраны шар з Венскага балю ў Будапешце. На кожным стэндзе свае сюрпрызы: вось цацкі шклянога прадпрыемства з Польшчы; а вось парцэлянавыя цацкі з Нідэрландаў у стылі славутай дэлфцкай парцэляны, вытанчаныя калядныя ўпрыгажэнні з Чэхіі і мануфактурныя цацкі з Германіі; а вось 12-сантыметровыя шары «Санта-Эрмітажа», на кожным — рэпрадукцыя славутага палатна: Ван Гог, Далі, Шышкін, ёсць і «Зялёны скрыпач» Шагала, і «Чорны квадрат» Малевіча. Што цікава, мастак, які робіць тыя рэпрадукцыі, дае пісьмовае абяцанне не паўтараць ніводнай з іх на працягу 10 гадоў.



З другога боку — суцэльная экзотыка: керамічныя статуэткі вешчуноў, саламяныя і сплеценыя з папярак упрыгажэнні з Афрыкі і Аўстраліі, кідкія чырвоныя з золатам ліхтарыкі і стужкі з Паўночнай Карэі, амерыканскія Санта-Клаусы і цукровыя палачкі-трысцінкі, скандынаўскія дабрадушныя алені, традыцыйныя цацкі з Ірана, Егіпта, Перу, Новай Зеландыі, Антыгуа і Барбуда. Напрыканцы — навагоднія віншаванні на беларускай, як з паштовак і газет 1970-х, так і з сучасных ёлачных упрыгажэнняў, зробленых рукамі беларускіх майстроў.



— Некалькі гадоў таму, калі мы ўпершыню выстаўлялі калекцыю, якраз тут, у гістарычным музеі, яна мела вялікі поспех — было каля 30 тысяч наведвальнікаў. І ў многіх лагічна ўзнікала пытанне: а дзе ж нашы, беларускія ёлачныя цацкі, таму давялося заняцца не толькі іх збіраннем, але і вытворчасцю, — усміхаецца **арганізатар праекта, калекцыянер і дырэктар айчыннай фабрыкі навагодніх цацак «Грай» Андрэй БЯГУН.** Агулам ягоная калекцыя ёлачных цацак налічвае каля дзвюх тысяч упрыгажэнняў, але дакладную лічбу назваць немагчыма, бо збор штогод як папаўняецца новымі экспанатамі, так і пазбаўляецца некалькіх выпадкова разбітых цацак. Уладальніка часта распытваюць пра самы дарагі экспанат, але ён задае сустрэчнае пытанне: з чым параўноўваць? «Я імкнуся прывозіць новыя цацкі з кожнага падарожжа, пабываў ужо больш чым у паўсотні краін. І, напрыклад, цацка з Афрыкі каштавала пяць долараў, гэта няшмат, аднак калі дадаць выдаткі на білет, пражыванне, ахову і г. д., то кошт па прывозе ў Беларусь узрасце ў шмат разоў». А самымі дарагімі ў душэўным сэнсе называе цацкі з дзяцінства — праўда, частку з іх разбіла кошка, якая ўявіла сябе ёлачным альпіністам. «Магчыма, пасля гэтай псіхалагічнай траўмы дзяцінства я наогул пачаў збіраць цацкі, — жартуе бізнесмен, — а цяпер, напэўна, стварэнне айчыннай ёлачнай цацкі стала для мяне ўжо справай жыцця. Таму найлепшае навагоднее пажаданне ад мяне — каб на ёлцы ў кожнага з нас былі беларускія цацкі з беларускай душой».





— З чаго раіце пачаць экскурсію?

— Перадусім з таго, як ствараюцца навагоднія цацкі: хто і як выдзімае шары, чым іх фарбуюць, хто прыдумляе малюнкі. Маленькім, думаю, прыйдзецца цікавы калядны гарадок, дзе шмат што рухаецца і грае музыка, старэйшым будзе даспадобы навагодняя фотазона, дарослых могуць прывабіць успаміны дзяцінства — фотакопіі савецкіх навагодніх паштовак, старыя цацкі альбо калекцыя Дзядоў Марозаў — вось гэты цёмнаскуры Санта-Клаус, напрыклад, прывезены з Ганы, а таго, які нагадвае Буду, па-мойму, я сустрэў у Інданезіі. Некаторыя з «дзядоў» ужо ва ўзросце, і мы стараемся па магчымасці іх не рэканструяваць, каб захаваць дух эпохі».

Навагоднія святы і канікулы надыдуць ужо хутка, а пройдуць імкліва, як усякая казка. Стаць яе часткай, вярнуцца ў дзяцінства і пакінуць сабе на памяць кавалачак цуда можна да 20 студзеня, пакуль працуе экспазіцыя Музея ёлачных цацак.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**
**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.**

Шануй сваё

# НАМ ЗАСТАЛАСЯ «СПАДЧЫНА»

**Днямі ў Нацыянальнай бібліятэцы адбылася прэм'ера дакументальна-ігравога фільма «Спадчына». 52-хвілінная кінастужка расказвае пра культурныя дасягненні Беларусі за часы яе незалежнага існавання.**

Іміджавая карціна наглядна дэманструе, як беларусам удалося аднавіць цэлыя пласты нацыянальнай культуры, дзякуючы якой нашу краіну цяпер ведаюць ва ўсім свеце. Здымала «Спадчыну» кінастудыя «Беларусьфільм» сумесна з Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі. Рэжысёрам кінастужкі выступіла тэледакументаліст Людміла Клінцова, а над сцэнарыем працавала гісторык, пісьменніца Ларыса Голубева.

— 25 гадоў для гісторыі — імгненне, а для дзяржавы — складаны перыяд станаўлення і развіцця. Былі спрэчкі адносна таго, пра што расказваць, і я адстойвала меркаванне, што культура, створаная беларускім народам і створаная для нашага народа, — гэта галоўнае, — расказвае **аўтар сцэнарыя фільма Ларыса ГОЛУБЕВА.** — Што адметнага ў нашай культуры за гэты час? Я назвала б два моманты: першы — прызнанне, што беларуская культура шматнацыянальная, і другі — нельга ўявіць беларускую культуру без нашых суайчыннікаў за мяжой. І ў фільме мы імкнуліся паказаць: немагчымае — магчыма.

«Я ўвогуле лічу, што культура — гэта нацыянальная бяспека. Таму што культура фарміруе свядомасць грамадзян. Калі чалавек ведае культуру, то яго радзіма, не толькі малая, а ўвогуле Беларусь, становіцца вельмі важнай і каштоўнай», — агучвае з экрана свае думкі **рэжысёр, мастацкі кіраўнік Нацыянальнага тэатра імя Янкі Купалы Мікалай ПІНІГІН.**

Фільм пункцірны, але дакладна распавядае пра тое, з якімі цяжкасцямі беларусам давялося сутыкнуцца на пачатку 90-х, калі руйнаваліся эканамічныя сувязі, узнікала мноства сацыяльных праблем, і як у гэтых абставінах прымаліся знакавыя рашэнні аб падтрымцы нацыянальнай культуры. Крок за крокам адсочваецца і дэманструецца гісторыя аднаўлення матэрыяльных і духоўных каштоўнасцяў Беларусі. Асобны акцэнт стваральнікі зрабілі на тэме адраджэння гістарычнага аблічча краіны і будаўніцтва знакавых аб'ектаў, якія сёння лічацца нашай візітнай карткай, — Нацыянальнай бібліятэкі, музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Не абмінулі ўвагай і Полацкі гісторыка-культурны запаведнік, Мірскі і Нясвіжскі замкі, рэканструкцыю Вялікага тэатра оперы і балета, Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы, Нацыянальнага мастацкага музея і шэрагу іншых аб'ектаў. У прыватнасці, упамінаецца аднаўленне некаторых духоўных святынь, сярод якіх крыж Еўфрасінні Полацкай, Слуцкае Евангелле. Адлюстраванне ў кінастужцы знайшлі вытокі і традыцыі — абрады і фальклор, а таксама сучаснае захаванне і папулярызацыя спадчыны нашымі суайчыннікамі, якія ў розныя часы выехалі за мяжу, але і там працягваюць шанаваць беларускую культуру.


Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

— Агляд гісторыі — фармат не з лёгкіх, таму што, шукаючы яркія моманты для сюжэтнай лініі, не заўсёды ўдаецца адлюстраваць усё тое, пра што хочаш расказаць, бо ёсць хронаметраж кінастужкі. У фільме мы быццам паказваем справаздачу за пэўны перыяд жыцця, і я хацела зрабіць гэта прыгожа. Імкнулася стварыць свайго роду візуальныя «паштоўкі», якія гледачы запомняць, — тлумачыць **кінарэжысёр Людміла КЛІНЦОВА.** — Гэта першая мая работа на «Беларусьфільме». Таму цікава, як вынік ацэняць гледачы: ці ўдалося данесці важнасць імёнаў і здабыткаў нашай культуры, ці ўзнікне ў кагосьці жаданне больш даведацца пра нашу спадчыну? Зразумела, фільм атрымаўся роўны, з некаторымі эмацыянальнымі ўсплёскамі і, як я кажу, момантамі ўдачы. Напрыклад, калі здымалі эпізод пра слуцкія паясы, можна было б абмежавацца проста здымкамі тэхнікі, але мы сустрэліся з людзьмі, якія сёння захоўваюць яе і працягваюць ствараць прыгажосць, і тады захацелася паказаць іх...

**Алена ДРАПКО.**

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Гомельоблстрой» (продавец) в лице антикризисного управляющего в деле о банкротстве Колеснева Н. М. извещает о проведении 26 декабря 2019 года открытого повторного аукциона по продаже имущества со снижением начальной цены на 65 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, без учета НДС (20 %), бел. руб. | Шаг аукциона – 5 %, бел. руб. | Сумма задатка, без учета НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| **Условие продажи:** **1)** Претендент на покупку (победитель) аукционных торгов самостоятельно и за свой счет проводит демонтаж, погрузку, транспортировку приобретенного на аукционе имущества. В случае нарушения целостности имущества Продавца при демонтаже и погрузке приобретенного имущества на Покупателя возлагается обязанность по приведению поврежденного имущества в первоначальное состояние. **2)** Действия по снятию с регистрационного учета транспортных средств, а также в случае необходимости получения регистрационных документов (при их отсутствии у Продавца) производится Покупателем на основании выданной доверенности Продавцом, за его счет и его силами. Переоформление документов на автотехнику и механизмы производится за счет покупателя. **3)** В соответствии с действующим законодательством РБ (в части изменения подпункта 2.30 пункта 2 статьи 115 в Налоговом кодексе РБ с 1 января 2019 года) **реализация имущества осуществляется без учета НДС 20 %** | | | | |
| **Местонахождение лотов №:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Борисенко, 8 | | | | |
| 6 | Блок-контейнер 6,0 х 2,45 м (на шасси), инв. № 687 | **945,00** | 47,25 | 94,50 |
| 7 | Блок-контейнер 6,0 х 2,45 м (на шасси), инв. № 686 | **945,00** | 47,25 | 94,50 |
| 13 | Вагон-дом 7,9 м х 2,7 м х 2,5 м (на шасси), инв. № 181 | **1015,00** | 50,75 | 101,50 |
| 14 | Вагон-бытовка 6,9х 2,5х3,04 м (на шасси) инв. № 20029 | **1085,00** | 54,25 | 108,50 |
| 15 | Вагон-дом 6,9 х 2,5 х 3,04 м (на шасси), инв. № 2026 | **1085,00** | 54,25 | 108,50 |
| 16 | Эстакада автомобильная 10,0 х 2 колеи: 0,8 м и 0,85 м, инв. № 1166 | **1260,00** | 63,00 | 126,00 |
| 19 | Станция насосная мод. 834/24В, инв. № 6911/6000000324PR. Станция штукатурная ШС-4/6 (СО-50-АМ), инв. № 5466 | **1318,45** | 65,92 | 131,85 |
| 20 | Установка для выдачи и перемешивания раствора У 342М, инв. № 698 | **840,00** | 42,00 | 84,00 |
| 21 | Штукатурная станция СШ-6 СО 50АМ, инв. № 5460/993 | **1050,00** | 52,50 | 105,00 |
| 22 | Штукатурная станция СШ-6 СО 50АМ, инв. № 665/119 | **1050,00** | 52,50 | 105,00 |
| 24 | Установка для приема товарного бетона УВР-4, инв. № 6922 | **1155,00** | 57,75 | 115,50 |
